ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 76 (2436)
26 верасня 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

МЕЛОДЫІ ЗЯМЛІ РОДНАЙ

Народны артыст СССР Р. Р. Шырма адказвае на пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» Б. Шарашэўскай.

На стале ў Рыгора Раманавіча Шырмы ляжыць раскрытая кніга...

— Узяў у выдавецтве. Зборнік беларускай паэзіі і прозы, прысвечаны Уладзіміру Ільічу. Выбраў 10—15 тэкстаў і мяркую раздаць кампазітарам. Рыхтуем з капэлай вялікую юбілейную праграму...

— Калі не сакрэт, чые вершы звярнулі на сябе вашу ўвагу? І калі ласка — падрабязней пра творы, што ўвойдуць у ваш святочны канцэрт.

— Мне здалося, што на некаторыя творы Максіма Танка, Петруся Броўкі, Пімена Панчанкі, Алеся Звонака, Уладзіміра Караткевіча, Анатоля Астрэйкі, што надрукаваны ў зборніку, могуць быць напісаны цікавыя хоры.

Пра юбілейную праграму капэлы цяжка сказаць зусім дакладна. Зразумела, што мы будзем яшчэ думаць, тое-сёе мяняць, дапаўняць, бо многія кампазітары для нас яшчэ пішуць. Мяне, як харавіка, крыху хвалюе, а можа гэта пачуццё зайздрасці, што сёння ў беларускай музычнай Ленініяне пераважнае месца займаюць інструментальныя творы.

— Чым вы гэта тлумачыце!

Рыгор Раманавіч усміхаецца.

— Тым, што некаторыя кампазітары ў дзяцінстве не спявалі ў школьных хорах... Але мяркуючы па тых цікавых вакальных творах, што адзін за адным зараз паяўляюцца, упэўнены, што мы будзем мець багаты харавы рэпертуар. Я амаль не ведаю кампазітараў толькі інструменталістаў, калі не лічыць Скрабіна, Мяскоўскага... Усе кампазітары заўсёды аддаюць даніну чалавечаму голасу — самаму дасканаламу інструменту.

Часам бывае трэба падказаць кампазітару, напомніць добры тэкст, на які можа быць напісаны цікавы твор для капэлы. Вось я і рашыў, як кажуць, узяць ініцыятыву ў свае рукі. Капэле патрэбны кантаты, маналогі з сімфанічным аркестрам, самыя разнастайныя формы...

У лютым — сакавіку будзе конкурс на лепшыя канцэртныя праграмы хораў Савецкага Саюза. Вядома, хацелася б, каб беларускія харавыя калектывы занялі ў ім дастойнае месца. Сёння ўжо ў нашай юбілейнай праграме ёсць шмат цікавых, на мой погляд, твораў. Па-першае, хочацца назваць кампазітара Анатоля Васільевіча Багатырова. Ён больш за іншых падтрымлівае ў Беларусі, калі можна так сказаць, харавое мастацтва. Анатоль Васільевіч добра ведае і любіць беларускую паэзію. Да ленінскага юбілею ён напісаў два маналогі з сімфанічным аркестрам, кантату «Леніну — слава» на словы Якуба Коласа. Вось і зараз я панясу яму некалькі тэкстаў, якія, думаю, павінны яго зацікавіць.

У нашу праграму ўвайшлі харавы твор кампазітара Мікалая Аладава «Навальніца» на словы І. Маркевіча і Кастуся Цвіркі, Кастуся Паплаўскага — «Трасцянец», тэкст Уладзіміра Караткевіча...

У юбілейны рэпертуар капэлы ўключаны творы рускіх савецкіх кампазітараў, кампазітараў іншых рэспублік, краін народнай дэмакратыі, кампазітараў-класікаў. Сярод іх — выдатны твор Дзмітрыя Шастаковіча «Пакараным», Анатолія Новікава — «Векавая мара», Вано Мурадэлі — «Ленін у Разліве», «Ленінскія Горкі» Тамары Папаценкі, «Спіце, любімыя браты» А. Пірумава, «Веснавая лірычная» Аляксандра Лекскага. Асобна хочацца вылучыць чатыры хоры Радзівона Шчадрына на ваенную тэматыку [тэкст Аляксандра Твардоўскага]. Кампазітар Андрэй Пашчанка напісаў для нас добры хор «Ты прыйдзі» на словы Янкі Купалы...

— Паколькі вы не толькі кіраўнік капэлы, але і старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі, не магу не спытацца пра новыя творы нашых кампазітараў, прысвечаныя вялікай даце.

— Усё, вядома, не пералічыш. Але я, напэўна, не памылюся, калі скажу, што няма ніводнага беларускага кампазітара, які б не прыняў удзелу ў беларускай музычнай Ленініяне. Назаву сімфанічную паэму М. Аладава «Народ і правадыр», вакальна-сімфанічную паэму Яўгена Глебава, кантату для баса, мецца-сапрана і сімфанічнага аркестра «Сонца ўстае за Волгай» Генрыха Вагнера, 4-ю сімфонію Льва Абеліёвіча, баладу для фартэпіяна на тэмы рэвалюцыйных песень Дзмітрыя Камінскага, цыкл хораў на словы беларускіх паэтаў Івана Кузняцова, песні кампазітараў Уладзіміра Алоўнікава, Юрыя Семяныкі, Дзмітрыя Смольскага, Ігара Лучанка. Старэйшы наш кампазітар Яўген Цікоцкі напісаў новую оперу на гісторыка-рэвалюцыйную тэму «Заранка».

— Дазвольце пытанне, якое крыху выпадае з плана нашага рабочага інтэрв'ю. Сярод публікацый розных жанраў музычнай літаратуры харавая займае далёка не адно з першых месц. А ўсяго капэл па Саюзе зараз, відаць, не больш за дваццаць. Ці не сведчыць гэта пра зніжэнне цікавасці да харавога мастацтва?

— Народ любіць харавую музыку. Гэта яшчэ раз пацвердзілі нашы сёлетнія гастролі. Мы давалі канцэрты на Украіне, у Растове, Тбілісі, Ерэване, Грозным, Арджанікідзе — і ўсюды сустракалі самы гарачы прыём. У Харкаве, напрыклад, амаль кожны нумар мы маглі бісіраваць. Далі восем канцэртаў толькі з сімфанічным аркестрам. У Тбілісі з поспехам выканалі араторыю для саліста, хору і аркестра «Па слядах Руставелі» кампазітара Атара Тактакішвілі. Зараз нас, разам з аўтарам, запрасілі выступіць з гэтым творам у Вільнюсе і Каўнасе.

Нотныя выдавецтвы сапраўды выпускаюць мала харавой літаратуры. Перш за ўсё — таму, што кампазітары часам забываюць пра тэзіс пра найцікавейшы жанр, які ўключае ў сябе і эпічныя, і героіка-драматычныя, і сатырычныя творы...

— У апошні час ідуць цікавыя пошукі ў галіне музычнага мастацтва, у такіх жанрах, як опера, балет, араторыя, сімфанічная паэма... Што вы можаце ў гэтым сэнсе сказаць пра харавое мастацтва?

— Пытанне цікавае і патрабуе, безумоўна, асобнай гутаркі. Вось, калі ласка, паглядзіце.

[Я трымаю ў руках нотны сшытак, на вокладцы якога напісана: «Рыгору Раманавічу Шырме прысвячаецца»].

— Гэта шэсць хораў кампазітара Андрэя Пашчанкі на вершы Сяргея Ясеніна. Дарэчы, першы з іх «Не вярнуся я ў бацькоўскі дом» увойдзе ў нашу юбілейную афішу. Гэтыя творы вельмі цікавыя, напісаны сучаснай мовай. Аўтар іх умее мыслець сімфанічна. Ён не ілюструе тэкст музыкай. У яго вельмі багатае гарманічнае, поліфанічнае развіццё. Кожны з гэтых хораў—закончаны сімфанічны твор, толькі са словамі і чалавечым голасам. Вось пачытайце, што піша сам аўтар.

[Я чытаю вытрымку з пісьма А. Пашчанкі Рыгору Раманавічу: «Галоўная мая мэта сімфанізаваць хор, каб на першым плане была музыка, музычны змест, не пагарджаю іншы раз і віртуознасцю...»].

— Такія хоры вельмі сучасныя. Вядома, яны патрабуюць сур'ёзнай працы, шмат рэпетыцый, але праца гэтая дае вялікае творчае задавальненне [калі, безумоўна, складанасць такога твора не фармальная]. Мы ведаем такія мастацкія ўзоры, як харавыя паэмы Шастаковіча, творы Свірыдава, Шчадрына. У нас, у Беларусі, валодаюць сімфанізмам у харавым жанры кампазітары Аладаў, Глебаў...

— Рыгор Раманавіч, вядома, якую грандыёзную —інакш цяжка яе назваць—працу робіце вы па зборы беларускіх народных песень. Выйшлі тры тамы вашага чатырохтомніка. Зараз, я ведаю, вы заканчваеце чацвёрты, у які ўваходзяць вясельныя песні і абрады. Калі ласка, некалькі слоў пра тое, над чым вы асабіста зараз працуеце.

— У друку знаходзіцца зборнік «Беларускія народныя песні для хору». У яго ўвайшлі сто песень. У другім томе будзе столькі ж. Гэта праца многіх дзесяткаў год. Калі я яшчэ выкладаў у гімназіі і кіраваў там хорам, ужо тады я пачаў іх збіраць, і гэта стала справай майго жыцця. У зборнік уваходзяць песні, у якіх адлюстравана жыццё беларускага народа, яго радасць і смутак, думкі аб долі, любоў да роднай прыроды, героіка змагання і працы. Сучасныя, каляндарна-абрадавыя, любоўныя, вясельныя, баладныя, сямейна-бяседныя, жартоўныя...

Разнастайнасць музычных апрацовак дасць магчымасць кожнаму хору знайсці для сябе матэрыял... Зборнік зможа стаць настольнай кнігай для харавых дырыжораў і аматараў харавых спеваў.

Я вельмі ўдзячны кампазітарам, якія дапамагалі мне ў гэтай працы. Яны любоўна абыходзіліся з нашымі песнямі і вярнулі народу іх у такой музычнай аправе, дзе шчыра падкрэслены і цудоўная краса, і бездакорная чысціня, і мудрая прастата беларускага народнага музычнага мастацтва. Многіх з гэтых кампазітараў ужо няма ў жывых. Хочацца назваць Грачанінава, які прыслаў мне песні з Парыжа. Ён з радасцю гэта рабіў, бо бачыў, напэўна, у тым сувязь з роднай зямлёй. Назаву Васіля Залатарова, Рыгора Пукста, Нестара Сакалоўскага, Аляксея Туранкова, Самуіла Палонскага, Мікалая Чуркіна.

Усе песні, што ўваходзяць у зборнік, выконваліся нашай капэлай, так што яны, калі можна так сказаць, праверваны жыццём. А гэта—найлепшая праверка. Іменна жыццё паказала, што толькі тыя музычныя творы вытрымліваюць такую праверку, якія маюць народную песенную аснову.

— У канцы верасня вы пачынаеце сезон. Што новага ў калектыве капэлы?

— Як і ўсюды, у капэле ідзе няспынны працэс амаладжэння. Побач з нашымі ветэранамі ў гэтым сезоне будуць працаваць маладыя артысты—выпускнікі Беларускай кансерваторыі. Спадзяюся, што яны знойдуць сваё месца ў нашым калектыве...

ГАНАРОВАЯ ЗАДАЧА ЛІТАРАТУРЫ

Адкрыты сход партарганізацыі СП БССР

Гісторыка-рэвалюцыйная тэма ў беларускай літаратуры — такое пытанне стаяла на парадку дня партыйнага сходу Саюза пісьменнікаў БССР, які адбыўся 23 верасня.

З дакладам выступіў Піліп Пестрак. Ён прааналізаваў шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры і працэсы, што адбываліся ў ёй; падкрэсліў, што гісторыка-рэвалюцыйная тэматыка ў творчасці беларускіх пісьменнікаў значна пашырылася за апошнія гады: спыніўся на недахопах, якія маюць месца пры асвятленні ў мастацкай літаратуры гістарычных рэвалюцыйных падзей на Беларусі.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел Пімен Панчанка, Аляксей Кулакоўскі, Мікалай Аляксееў, Хведар Жычка, Алесь Кучар, Еўдакія Лось, Адам Мальдзіс, Уладзіслаў Нядзведскі, Уладзімір Юрэвіч і народны мастак БССР Заір Азгур.

У сваіх выступленнях яны гаварылі пра тое, што ўжо зроблена нашымі пісьменнікамі па адлюстраванні гераічнага мінулага беларускага народа, выказалі шэраг прапаноў па палепшанні якасці мастацкіх твораў на гэту тэму, падзяліліся сваімі думкамі аб тым, што трэба зрабіць, каб пашырыць і папоўніць новымі творамі беларускую літаратурную Ленініяну.

Сход разгледзеў таксама пытанне арганізацыі палітвучобы на новы навучальны год і прыняў адпаведную пастанову.

РЫСЫ ВЯЛІКАГА ВОБРАЗА

Цесная дружба звязвае народнага мастака СССР М. Жукава з вучнямі 35-й сярэдняй школы Гомеля. Мастак выбраны ганаровым членам савета створанага ў школе Ленінскага народнага музея. У падарунак юным ленінцам школы М. Жукаў даслаў серыю рэпрадукцый сваіх малюнкаў аб жыцці і рэвалюцыйнай дзейнасці Ільіча, а таксама зроблены спецыяльна для школьнага музея малюнак «Валодзя Ульянаў у год смерці брата».

У ленінскім музеі школы захоўваюцца рэпрадукцыі малюнкаў і пісьмы лаўрэатаў Міжнароднай Ленінскай прэміі Херлуфа Бідструпа і Жана Эфеля.

Ф. РАМАШОЎ.

САЛДАЦКАЙ СЛАВЫ ПЕСНЯ ЗВОНКАЯ

ПРА ансамбль песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі можна пісаць вельмі многа... Ветэраны ансамбля прайшлі з баямі і канцэртамі па франтах Вялікай Айчыннай вайны. Выступалі не толькі ў шпіталях, а і на перадавой пад гул варожых гармат. За актыўную культурна-масавую работу, за мужнасць і гераізм 62 артысты ансамбля ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі Савецкага Саюза.

Сёння ў калектыве захоўваецца цікавая карта, на якой паказаны баявы шлях канцэртных брыгад ансамбля — Заходні і трэці Беларускі франты. А пасля вайны — Масква, Кіеў, Рыга, Польская Народная Рэспубліка.

Толькі сёлета адбылося больш за 120 выступленняў у часцях і падраздзяленнях Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, у жодзінскіх аўтамабілебудаўнікоў, Барысаўскім гарадскім Доме культуры, Мінскім палацы прафсаюзаў, піянерскім лагеры на возеры Нарач і ў іншых месцах.

За сваю больш чым трыццацігадовую гісторыю ансамбль даў звыш васьмі тысяч канцэртаў, падрыхтаваў больш як шэсцьсот розных твораў рускай і заходнееўрапейскай класікі, савецкіх кампазітараў, беларускіх аўтараў.

Важная вяха ў творчым жыцці ансамбля — удзел у першай і другой Дэкадах беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве, вялікі канцэрт на сцэне Крамлёўскага тэатра.

Гісторыя ансамбля — удзячная тэма для нарыса. Але ў мяне больш сціплая задача — у газетным рэпартажы расказаць, чым сёння жыве ансамбль — артысты хору, аркестра, яго танцавальнай групы.

Аснову калектыву складаюць маладыя воіны. Тут праходзіць іх нялёгкая салдацкая служба, тут нараджаюцца сапраўдныя артысты, многія з якіх застаюцца ў ансамблі на доўгія гады...

Гэты год для калектыву асаблівы: артысты рыхтуюць новую канцэртную праграму, якую прысвячаюць ленінскаму юбілею.

— Святочны канцэрт, — гаворыць мастацкі кіраўнік ансамбля дырыжор Дзмітрый Віктаравіч Фалілееў, — зразумела, павінен быць глыбокім па змесце, паказаны на тым высокім мастацкім узроўні, які заўсёды ўласцівы савецкім артыстам. Мяркуем узнавіць у канцэрце асноўныя этапы жыцця Радзімы за гады Савецкай улады. Будзе песня пра тых, хто штурмаваў Зімні палац, будуць песні, прысвечаныя партыі. Прагучаць мелодыі часоў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Пра сённяшнія будні нашай арміі раскажуць баявыя маршавыя, жартоўныя і лірычныя салдацкія песні, а таксама танцы.

З юбілейнай праграмай мы спадзяёмся выступіць не толькі перад воінамі, але і ў канцэртнай зале філармоніі, а магчыма ў Палацы спорту. Хацелася б, каб больш мінчан ды і жыхароў іншых гарадоў Беларусі бывала на нашых канцэртах, каб яны ведалі армейскі ансамбль. Толькі не палічыце гэта за нясціпласць. Аўдыторыя артысту патрэбна, як чытач пісьменніку, як балельшчык спартсмену...

А пакуль што ідуць рэпетыцыі. Зойдзем. Як кажуць, да сёмага поту танцуюць артысты балета, адшліфоўваюць кожную музычную фразу аркестранты, бясконца паўтараюць свае партыі харысты.

Заняткі ў хоры вядзе выхаванец Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі хормайстар Якаў Яравой. Хор спявае песню ўкраінскага кампазітара А. Пашкевіча «Стэпам, стэпам». І саліст Генадзь Макоўскі, і магутны мужчынскі хор, якому цесна ў невялікай зале, дзе адбываецца рэпетыцыя, расказваюць аб гераізме адданых Радзіме сыноў, пра вялікае гора і пакуты адзінокай маці, якая чакае сына і якая ніколі яго не дачакаецца...

А вось ужо загучала знаёмая з маленства народная песня «А ў полі вярба». Запяваюць Міхаіл Мацюшэўскі і Фёдар Буровін.

А калі наперад выходзіць невысокага росту, бадай самы сціплы і працавіты ў ансамблі саліст заслужаны артыст рэспублікі Георгій Светашэў, цудоўныя гукі яго голасу палоняць усіх. Лірычная салдацкая песня В. Аляксеева «Ля далёкай ваколіцы» ў акапэльным выкананні хору пры ўдзеле Георгія Данілавіча гучыць задуменна, пранікнёна...

Здаецца, слухаў бы доўга-доўга. Але я ведаю, што недзе ў другіх пакоях Мінскага акруговага Дома афіцэраў ідуць заняткі аркестра і балета...

Чароўнае царства рытму, пластыкі, адухоўленасці панае ў класе... А за гэтым цяжкі, бясконцы, штодзённы трэнаж. Балетмайстар Васіль Кузняцоў ставіць «Танец пераможцаў». Гераічная харэаграфічная варыяцыя расказвае пра сустрэчу воінаў-пераможцаў у Мінску. Нявеста сустракае жаніха, маці — сына, стары партызан — свайго лепшага сябра. У гэтым канцэртным нумары занята ўся танцавальная трупа. Вядучыя партыі выконваюць артысты Алег Барадаўкін, Эдуард Багадаеў, Анатоль Струеў, Вячаслаў Шабаеў, ветэран ансамбля Павел Ясеў і іншыя. Музыка танца — канцэртмайстра ансамбля Анатоля Марозава.

Ужо гатовы «Украінскі танец», які артысты выконваюць імкліва, з агнявым тэмпераментам. У задуме — невялікая харэаграфічная навела ў сучасных рытмах і на сучасную музыку.

Пройдзе час, і пачнуцца рэпетыцыі танцораў разам з аркестрам. А пакуль што ідзе «прыцірка» хору і аркестра.

Тут гаспадарыць мастацкі кіраўнік ансамбля Дзмітрый Фалілееў. Усё тут надавычай строга, падпарадкавана разумнай волі дырыжора, настаўніка, выхавацеля, мастака.

Выконваецца ўступ да вядомай песні М. Багаслоўскага «Цёмная ноч». У аркестры — хлопцы, якія ніколі не бачылі вайны (як хацелася б, каб яны ніколі не сустрэліліся з ёй!). Таму словы дырыжора такія важныя для іх:

— Уявіце сабе ноч перад боем. Што будзе заўтра — не ведае салдат. Але ў яго ёсць некалькі гадзін для ўспамінаў. І салдат успамінае свой дом, любімую жанчыну, сына...

Наступіла доўгая паўза.

— Уявілі? А цяпер давайце паспрабуем сыграць яшчэ раз...

І палілася празрыстая задуменная музыка...

Ударны нумар будучага канцэрта — «Песня аб партыі» Б. Аляксандрава. Складаны для выканання твор патрабуе высокай харавой культуры, магутнага зладжанага гучання хору і аркестра. Арыгінальная ўвертюра да гэтай песні, у якой праходзіць тэма «Інтэрнацыянала». Над гэтым творам зараз многа працуюць у калектыве і дырыжор, і хормайстар, і салісты Аляксандр Ларчанкаў і Сцяпан Бацюшкоў.

Ёсць у ансамблі творы, якія можна лічыць амаль завершанымі. Лёгка, гулліва выконваецца лірычная салдацкая песня А. Краўчанкі «Расіянічка» (саліст Фёдар Буровін). А колькі іскрыстага гумару, весялосці ў «Салдацкай калыханцы» Р. Партнова, у віхурнай, імкліва песні «Самавары-самапалы» А. Новікава, якая ўслаўляе салдацкае маладзецтва, адвагу, сілу і спрыт (салісты Іван Гарбушын і Аляксандр Ларчанкаў)!

Праграма канцэрта абяцае быць разнастайнай. Пра ўсе творы не раскажаш. Ды, зрэшты, гэта пакуль што сакрэт калектыву...

Я. ДАНСКАЯ.

Зараз мастацкі кіраўнік ансамбля Дзмітрый Фалілееў узмахне рукой, і загучыць музыка...

Ветэран ансамбля заслужаны артыст рэспублікі Б. Макараў (у цэнтры) дзеліцца ўспамінамі пра выступленні канцэртных брыгад на франтах Вялікай Айчыннай...

Фота А. ЛУКАШОВА.

БУДЗЕМ СВЯТКАВАЦЬ РАЗАМ

ПЕРАД УРАЧЫСТАСЦЯМІ, ПРЫСВЕЧАНЫМІ 20-ГОДДЗЮ ГДР

Гэтымі днямі ў нашай рэспубліцы пачнуцца ўрачыстасці, прысвечаныя 20-годдзю Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» сустрэўся з адказным сакратаром праўлення беларускага аддзялення Савецкага таварыства дружбы з ГДР Г. Юшкевічам і пагутарыў з ім. Вось што ён расказаў:

— З кожным годам пашыраюцца эканамічныя і культурныя сувязі ГДР з Савецкім Саюзам і, у прыватнасці, з Беларуссю. Наша рэспубліка пастаўляе сябрам з Дэмакратычнай Германіі трактары, падшыпнікі, металарэжучыя станкі, пад'ёмныя краны, гадзіннікі. Ні на адзін дзень не спыняецца культурны абмен паміж нашымі народамі. З Беларусі ідзе ў ГДР мастацкая, грамадска-палітычная і спецыяльная літаратура, фотападборкі, артыкулы, фотанарысы, спецыяльныя інфармацыйныя выданні «Савецкая Беларусь сёння».

Узрасла цікавасць да беларускай літаратуры ў ГДР. У перакладзе на нямецкую мову выдадзены асобныя творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Янкі Брыля, Макара Паслядовіча, Тараса Хадкевіча і іншых пісьменнікаў.

Грамадскасць нашай рэспублікі таксама праяўляе вялікі інтарэс да нямецкай літаратуры. На старонках беларускіх перыядычных выданняў усё часцей публікуюцца ў перакладах творы Э. Вайнерта, І. Бехера і іншых пісьменнікаў. У нас выдадзены асобнымі выданнямі зборнік выбраных твораў Генрыха Гейне, аповесць Анны Зэгерс «Чалавек і яго імя», раман Людвіга Рэна «Вайна без бітвы» і іншыя. Слаўныя перакладчыцкія традыцыі Максіма Багдановіча ў папулярызацыі нямецкай класічнай паэзіі (Гётэ, Шылера, Гейне) працягваюць сучасныя беларускія паэты і перакладчыкі Ю. Гаўрук, С. Ліхадзіеўскі, А. Зарыцкі, П. Бітэль, Я. Семяжон, В. Сёмуха.

Зараз у Савецкім Саюзе праходзіць месячнік дружбы паміж СССР і ГДР, прысвечаны 20-годдзю з дня заснавання першай у гісторыі Германіі дзяржавы нямецкіх рабочых і сялян.

Мы чакаем гасцей. Праз некалькі дзён да нас, у Беларусь, прыедуць сябры з ГДР. 29 верасня у памяшканні ВДНГ адкрыецца выстаўка прамысловых тавараў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. У рэспубліканскім Доме мадэляў мінчане і госці сталіцы змогуць паглядзець лепшыя ўзоры адзення, распрацаваныя нямецкімі мадэльерамі.

1 кастрычніка ў кінатэатрах сталіцы і іншых гарадоў рэспублікі пачнецца фестываль нямецкіх фільмаў. У той жа дзень аматары кнігі агледзяць у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Леніна выстаўку нямецкай кнігі.

6 кастрычніка ў Палацы прафсаюзаў адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны 20-годдзю з дня заснавання Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. На вечары будзе прысутнічаць дэлегацыя ГДР на чале з генеральным консулам ГДР Ірмгардам Зікертам. У фае палаца размесціцца фотавыстаўка, якая раскажа пра жыццё рэспублікі.

Урачыстыя вечары, прысвечаныя 20-годдзю ГДР, адбудуцца ў Гомелі, Віцебску і іншых гарадах рэспублікі. У госці да студэнтаў Мінскага інстытута замежных моў і рабочых камвольнага камбіната завітаюць студэнты з ГДР.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

БРЭСТ, НАБЯРЭЖНАЯ МУХАЎЦА



З 1964 года ў Брэсце вядуцца работы па забудове набярэжнай ракі Мухавец. Гэта візітная картка Брэста. Адсюль пачынаецца знаёмства з горадам для таго, хто ўязджае ў яго з захаду.

На адрэзку ад вуліцы Савецкай да бульвара Шаўчэнкі Мухавец ужо апрануўся ў бетон.

Цяпер распрацоўваюцца рабочыя чарцяжы мікрараёна, які раскінецца па правы бок ад камунальнага моста праз Мухавец. Пабудаваны некалькі пяціпавярховых жылых дамоў, сад-яслі на 280 дзяцей. Пойма Мухаўца дазваляе ў гэтым месцы надаць забудове асаблівую выразнасць, і аўтар праекта мікрараёна архітэктар А. Кудзіненка мяркуе паставіць тут тры 12-павярховыя жылыя дамы тыпу «разгорнутая кніга».

Земснарады намываюць зараз пляцоўку, на якой будзе пабудаваны стадыён на 30 тысяч гледачоў, дом фізкультуры, палац спорту, вяслярная база з каналам для байдарак і каноэ. Праектнае заданне распрацоўваюць абласныя майстэрні «Белдзяржпраекта».

Паміж вуліцамі Савецкай і Савецкіх пагранічнікаў, там, дзе бераг Мухаўца крута ідзе ўгору, запраектаваны Дом культуры на 1200 месц. За аснову ўзяты праект маскоўскіх архітэктараў.

У сілуэт набярэжнай увойдзе і вежа самай высокай у горадзе гасцініцы «Інтурыст» на вуліцы Маскоўскай.

На беразе Мухаўца атрымаюць кватэры каля 20 тысяч брастаўчан.

УСЕСАЮЗНЫ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

ЧАЛАВЕКУ ПАТРЭБНА КНІГА

ЗАПШОЎ неяк у Барысаўскую гарадскую бібліятэку малады майстар завода аўтатрактарнага абсталявання Мікалай Маліноўскі:

— Ці ёсць у вас работа Леніна «Вялікі пачын»? Вельмі мне яна патрэбна...

Мікалай уважліва прачытаў твор, выпісаў сабе ў блакнот думкі Ільіча аб прадукцыйнасці працы, працоўнай дысцыпліне. Аб прачытаным Маліноўскі расказаў рабочым. Пасля зноў завітаў у бібліятэку параіцца, як данесці да іх думкі правадыра. Работнікі бібліятэкі не толькі паралі правесці канферэнцыю «Ленін аб працоўнай дысцыпліне», але і самі прынялі ў ёй актыўны ўдзел. Адбылася шчырая змястоўная размова аб прадукцыйнасці працы, якасці выпускаемай прадукцыі, аб працоўнай дысцыпліне.

Зараз маладзёжны ўчастак майстра Маліноўскага адзін з лепшых на заводзе. Тут сістэматычна выконваюцца нормы выпрацоўкі, высокая якасць прадукцыі. Многія члены брыгады самастойна вывучаюць творы правадыра.

Падобных прыкладаў можна прывесці шмат. Авалоданне ленінскай спадчынай стала жыццёвай патрэбай савецкіх людзей. І чым бліжэй падыходзім мы да вялікага свята — 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, тым большым становіцца попыт на кнігі правадыра і літаратуру аб ім. Усё часцей людзі звяртаюцца да твораў Ільіча, раяцца з ім, дзеляцца думкамі і клопатамі, рапартуюць аб поспехах у працы. Рабочы і калгаснік, вучоны і пісьменнік, юнак і ветэран знаходзяць у ленінскіх творах адказы на самыя складаныя пытанні.

Бібліятэкі Мінскай вобласці, а ў нас іх амаль паўтары тысячы, маюць кніжны фонд у адзінаццаць мільёнаў экземпляраў, у тым ліку каля пяцісот тысяч кніг У. І. Леніна і твораў аб ім. Гэта вялікае духоўнае багацце. І бібліятэкары імкнуцца найбольш мэтанакіравана выкарыстоўваць яго, праводзяць разнастайную і цікавую работу па прапагандзе ленінскай спадчыны.

«...Лепшым помнікам Уладзіміру Ільічу Леніну будзе шырокае масавае распаўсюджванне яго твораў, якое зробіць ідэі камунізма здабыткам усіх працоўных». Гэтыя словы з пастановы II з'езда Саветаў СССР сталі дэвізам работнікаў Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэкі імя Н. К. Крупскай. З дапамогай гаркома камсамола і гарадской арганізацыі таварыства «Веды» тут арганізаваны ленінскія чытанні. Яны праводзяцца не толькі ў канферэнц-зале бібліятэкі, але і на прадпрыемствах і ва ўстановах горада. Ужо сёлета ленінскія чытанні адбыліся амаль у дваццаці арганізацыях.

Але ў Маладзечна не абмяжоўваюцца чытаннямі, а выкарыстоўваюць розныя формы і метады масавай работы — тэматычныя вечары, канферэнцыі чытачоў, сустрэчы са старымі камуністамі. Вось, напрыклад, вусны часопіс «Ленін і Беларусь». Першая яго старонка прысвечана ролі Леніна ў стварэнні Савецкай Беларусі, другая — расказвае аб нашых землях — паплечніках правадыра, на наступных старонках ідзе гаворка пра Ленініяну беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў. Часопіс нікога не пакідае раўнадушным, надоўга запамінаецца слухачам.

Адышоў час, калі бібліятэкар толькі выдаваў і прымаў кнігі. Больш складаныя сталі абавязкі бібліятэкара. Сёння ён павінен быць лектарам і дакладчыкам, умелым прапагандыстам і добрым арганізатарам. Яму цяжка справіцца аднаму, і яго добрым памочнікам можа быць сам чытач. Трэба толькі, каб бібліятэкар бліжэй стаяў да вытворчасці, працоўнага калектыву.

Але вось ленінскі твор прачытаны. Чалавек пазнаёміўся з кнігай, захацеў прачытаць яшчэ што-небудзь, каб лепш вывучыць закранутыя ў гэтай рабоце пытанні. І тут на дапамогу яму павінен прыйсці бібліятэкар. Бо ніякая тэматычная кніжная выстаўка, ніякі бібліяграфічны агляд не заменіць жывога слова работніка бібліятэкі.

Каля пяцідзесяці чытачоў Мядзельскай раённай бібліятэкі з дапамогай бібліятэчных работнікаў склалі свае індывідуальныя планы чытання. Напрыклад, рабочы «Міжкалгасбуда» В. Собалеў прачытаў сёлета каля двух дзесяткаў кніг. Сярод іх сем—ленінскай тэматыкі. Шмат чытае слесар І. Малевіч. У яго картцы ўспаміны паплечнікаў Ільіча — Крржыжаноўскага, Гарбунова, Крупскай і іншых.

Разумныя парады і індывідуальныя гутаркі з чытачамі маюць асаблівае значэнне ў рабоце сельскіх бібліятэк. У іх малыя памяшканні, адсутнічаюць чытальныя залы, не заўсёды можна раскрыць кніжныя фонды, аформіць выстаўкі, стэнды з рэкамендацыйнымі спісамі ленінскай літаратуры. А дзе індывідуальная работа стала асноўнай формай прапаганды кнігі, там ёсць і станоўчыя вынікі.

Аднак трэба зрабіць адну заўвагу. Планы чытачоў павінны заўсёды зыходзіць з агульна-адукацыйнага ўзроўню, узросту і прафесіі чалавека. Калі не ўлічваць гэтага, чытанне па індывідуальных планах будзе не вывучэннем работ Ільіча, а выдачай кніг для «галачкі».

Асаблівай увагі заслугоўвае зараз прапаганда перадавога вопыту работы бібліятэк. За апошні час з'явілася шмат новых і цікавых форм прапаганды кніг. Слава пра некаторыя нашы бібліятэкі выйшла далёка за межы рэспублікі. Крупская раённая бібліятэка, напрыклад, ужо двойчы была ўдзельніцай Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве, атрымала ганаровую назву «Бібліятэка выдатнай работы». Яна стала сапраўдным цэнтрам метадычнай дапамогі сельскім, прыклубным, прафсаюзным і школьным бібліятэкам раёна. Тут створан добры метадычны кабінет, які падтрымлівае сувязі з сарака метадычнымі цэнтрамі Савецкага Саюза, і ўсё лепшае, што ёсць у бібліятэках краіны, становіцца здабыткам культасветустаноў раёна.

Палітычная інфармацыя — справа зусім новая ў рабоце бібліятэк. Вось чаму своечасовым і карысным з'явіўся выпуск метадычнай распрацоўкі «Палітычная інфармацыя ў бібліятэках», падрыхтаванай Мінскай абласной бібліятэкай імя Пушкіна. У ёй разам з агульнымі пытаннямі інфармацыі даюцца карысныя парады, як лепш пазнаёміць чытачоў з ленінскай спадчынай, расказваецца аб такой новай форме палітычнай інфармацыі, як «Ленінскі каляндар» і інш. Думаецца, што гэтая распрацоўка асабліва зацікавіць сельскіх бібліятэкараў. Яна дапаможа ім лепш інфармаваць сваіх чытачоў аб падзеях у нашай краіне і далёка за яе межамі.

Калі сёння мы вядзём размову пра прачытаныя рабочымі, калгаснікамі ленінскія кнігі, адразу бывае цяжка заўважыць тут сувязь з выпрацоўкай на вытворчасці, з паводзінамі чалавека ў жыцці. Але сувязь гэтая ёсць. Мне здаецца, што ўдасканаленне форм і метадаў работы масавых бібліятэк, прапаганда багатай ленінскай спадчыны, паляпшэнне індывідуальнай работы і дыферэнцыраванага абслугоўвання розных груп чытачоў, дапамагаюць вырашаць адну з самых складаных задач — выхаванне новага чалавека.

І поспех у гэтай справе прыходзіць не да тых, хто гоніцца за хуткім ростам кнігавыдач, а да тых, хто ўдумліва працуе з чытачамі, паступова пашырае кола іх інтарэсаў, вучыць любіць і шанаваць вялікі цуд чалавечага розуму — кнігу.

Л. СУШКЕВІЧ,
інструктар Мінскага абкома КПБ.

ГАСТРОЛЬНАЕ ЛЕТА НЕ КОНЧЫЛАСЯ

КЛАСІКА Ў ЖЫТОМІРЦАЎ

Гісторыя ўкраінскага музычнага тэатра мае глыбокія карэнні і традыцыі. Жанр музычна-драматычнага спектакля, у якім музыка гучыць нароўні са словам, карыстаецца на Украіне вялікай любоўю.

Жытомірскі тэатр, які знаходзіцца цяпер на гастролях у Мінску таксама знаёміць гледачоў з творамі ўкраінскай класікі.

Хочацца спыніцца на двух з гэтых спектакляў, — «Майская ночы» Мікалая Лысенкі і «Кацярыне» Мікалая Аркаса. Гэтыя спектаклі, напісаныя ў традыцыях украінскага музычнага тэатра, даюць, мне здаецца, калектыву магчымасць паказаць яго пошукі, творчыя імкненні, традыцыі і мастацкае крэда.

Гісторыя ўкраінскага музычнага тэатра цесна звязана з імем вялікага Гогаля. Родную Украіну, яе людзей, яе старадаўнія паданні і абрады, сумныя і вясёлыя песні, дзявочыя карагоды і заліхвацкія танцы хлопцаў, яе прыроду ўслаўляе Гогаль у «Майскай начы». Аповесць паслужыла асновай для оперы М. Лысенкі «Майская ноч», напісанай у 1881 годзе ў садружнасці з выдатным украінскім драматургам М. Старыцкім. Уласцівае Старыцкаму майстэрства і веданне сцэны дазволілі яму стварыць операнае лібрэта, цікавае і для сённяшняга гледача.

Музыка оперы бярэ свае вытокі ў народна-песеннай і танцавальнай творчасці. Харавыя сцэны ў спектаклі — важны сродак раскрыцця ў музыцы сцэнічных сітуацый. Успомнім песню хлопцаў «Туман ярам коціцца, гуляць хлопцам хочацца», з першай дзеі, якая ўводзіць у атмасферу вясёлых гульбішчаў сельскай моладзі, або карагоды дзяўчат «Заўю вянкі на ўсе святкі».

На жаль, якраз танцавальна-харавыя і масавыя сцэны — самыя слабыя месцы пастаноўкі (дырыжор Г. Аганезаў, хормайстар В. Палішчук, балетмайстар А. Каркавідаў). Хору не заўсёды хапае паўнаты і роўнасці гучання, выразнасці тэмбру, багацця фарбаў. Так, напрыклад, хор «Туман хвалямі лягае» з першай дзеі, які перадае паэтычную карціну летняга вечара, патрабуе большай чуласці і тонкасці выканання, больш высокага прафесіяналізму, без чаго нельга перадаць харавую поліфанію. Не заўсёды ў спектаклі зладжаны і ансамбль, здзіўляюць разыходжанні хору і аркестра. Не задавальняе і выкананне аркестравай партыі оперы. Несыгранасць ансамбля, тэхнічныя хібы ў выкананні, нарэшце, няпоўны склад аркестра знижаюць мастацкую якасць спектакля. Асабліва, на мой погляд, гэта адчувальна ў фантастычных сцэнах і ў фіналах дзеяў.

Калі ж фантастычным сцэнам не хапала маляўнічасці, разнастайнасці аркестравых тэмбраў, то фіналам — аркестравай магутнасці, яркасці і бляску выканання.

Не заўсёды суразмерная гучнасць хору і аркестра. Гарэзлівае, тэмпераментнае выкананне, у прыватнасці, танцавальных нумароў, часам кантраставала з бляклым, невыразным аркестравым суправаджэннем. Відаць, не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае і тое, што маленькі склад аркестра не заўсёды можа справіцца з партытурай, разлічанай на вялікі калектыў музыкантаў. Тут непазбежна знижэнне мастацкай якасці.

Масавым танцавальным сцэнам нестае вынаходлівасці і мяккасці. Асабліва гэта датычыцца жаночых танцавальных нумароў у фантастычных сцэнах, сакавітая музычная мова якіх дае багатыя магчымасці балетмайстру для пошукаў.

На фоне масавых сцэн развіваецца і асноўная сюжэтная лінія оперы, светлае і чыстае каханне вясковага хлопца Ляўко (артыст А. Пугач), сына сельскага галавы і Галі (артыстка В. Петраш).

Ляўко ў оперы — не «блакітны» лірычны герой, яму ўласцівы гумар, юнацкая задзірыстасць, парыванні. Выканаўцу Ляўко ў жытомірскім тэатры не хапае часам так патрэбнай для стварэння шматграннага характару шчырасці, гарэзлівасці, гнуткасці. Гэта датычыцца і музычнага і драматычнага ўвасаблення вобраза.

Варта наогул адзначыць моманты «канцэртнасці» выканання, уласцівай многім акцёрам. Часам няма сувязі з партнёрам, акцёр проста спявае «на гледача». Гэта прыводзіць да неапраўданасці некаторых мізансцэн.

Больш прыемнае ўражанне ў спектаклі пакідаюць камедыйныя персанажы: Сваячніца (заслужаная артыстка УССР М. Мар'яноўская), Пісар (заслужаны артыст УССР В. Несцярэнка) і Каленік (артыст В. Толак). Акцёрам удаецца стварыць яркія каларытныя народныя характары.

Побач з М. Гогалем у многім вызначае развіццё украінскага музычна-драматычнага мастацтва і Тарас Шаўчэнка. Адным з першых, хто ўвасобіў у операй музыцы паэзію Шаўчэнкі, быў украінскі кампазітар М. Аркас. Ён звярнуўся да славутай паэмы пісьменніка «Кацярына». Опера гэта заваявала папулярнасць у масавага гледача сацыяльнай завостранасцю сюжэта, меладычнай шчодрасцю, напеўнасцю і прастатой.

Жытомірскаму тэатру ў многім удаецца данесці да слухача мастацкія вартасці оперы (рэжысёр В. Толак, дырыжор Г. Аганезаў, мастак заслужаны дзеяч мастацтваў УССР І. Шаўчэнка). Сугучны твору М. Аркаса відовішчны фон з характэрнымі асаблівасцямі ўкраінскага сяла добра спалучаецца з музыкай і ігравымі момантамі. Поспеху оперы, вядома, спрыяе і акцёрскі склад, шчырасць і непасрэднасць іх выканання.

Партыю Кацярыны спявае артыстка З. Суслава, ужо вядомая мінскаму слухачу па папярэдніх спектаклях: «Майская ноч» (Панначка), «Пад чорнай маскай» (Алёнушка). Добры роўны голас, музычны густ і такт у гэтай актрысы. Суслава хутчэй за ўсё артыстка лірычнага плана. Таму лірычны бок больш за ўсё ўдаецца ёй у вобразе Кацярыны. Але Кацярына вобраз у оперы дынамічны і актыўны: ён паказаны ў развіцці. З вясёлай, бестурботнай дзяўчыны яна становіцца ў канцы няшчаснай жанчынай. Вось тут Кацярыне — Суславай несумненна не хапае драматызму, які часам падымаецца да трагедыйнасці, дынамізму і напалу, якія асабліва неабходны ў трэцяй дзеі. Даволі ўспомніць вядомую «Калыханку», якую яна, рашыўшы пайсці на самагубства, спявае над сваім дзіцем, або арыю «Мой бацечка, мой братачка, хоць ты не цурайся».

Дарэчы сказаць, не хапае актыўнасці, а часам і драматычнага напружання і Андрэю (артыст В. Палішчук) у другой дзеі ў сцэне з бацькам і маці Кацярыны. Моцнае ўражанне пакідае арыя маці (артыстка Е. Крулікоўская) у другой дзеі.

І ў гэтым спектаклі нас мала радуе аркестр. Дый аркестравая партыя ў оперы М. Аркаса ў цэлым даволі слабая, а часам і проста прымітыўная. Аднак у многіх эпізодах оперы (у прыватнасці, ва ўступе да трэцяй дзеі) кампазітару ўсё ж удаецца цалкам увасобіць свае задумы. Спектаклю не хапае яркіх кульмінацыйных вяршынь, дынамічнасці і напорыстасці, асабліва ў драматычных сцэнах, у якіх не апошняя роля належыць і аркестру.

Жытомірскі тэатр працягвае свае гастролі ў Мінску. Будзем спадзявацца, што наступныя яго спектаклі, у прыватнасці, славутая «Наталка-Палтаўка», якая невядома па якіх меркаваннях пераносіцца на больш позні тэрмін, будуць з задавальненнем сустрэты мінскім слухачом.

«Пад заслону» прынята гаварыць гасцям добрыя словы. Мне здаецца, што самае галоўнае гаварыць праўду. Я жадаю жытомірцам творчага росту, прафесіянальнага ўзлёту і поспехаў на гэтым нялёгкім шляху.

Раіса СЕРГІЕНКА.

НА ТЭМЫ МАРАЛІ

ЗДАРЫЛАСЯ Ў АНТОПАЛІ ГІСТОРЫЯ...

М. ЗАМСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва»

ЭХ, КАБ было ў свеце ўсё толькі або белае, або чорнае. Каму-каму, а нашаму брату-газетчыку жылося б куды лягчэй. Прыехаў, паглядзеў: станоўчае — хвалі, адмоўнае — кляні. Вось і ўся тая работа...

Каб жа так было...

Я сяджу перад чыстым аркушам паперы, зноў і зноў перабіраю ў памяці гэту гісторыю і адчуваю сябе чалавекам, якому выпала пусціца бурлівым морам у далёкую небяспечную дарогу.

...Пайсці ў рэдакцыю ёй параіў адзін наш вядомы і паважаны пісьменнік, якому яна расказала пра сваё жыццё. Цяпер жанчыне — будзем называць яе Марыяй Адамаўнай — трэба было ўсё расказаць спачатку, і яна, мабыць, збіраючыся з сіламі, доўга сядзела моўчкі, нервова камячачы ў руках хусцінку.

Я глядзеў на яе выпакутаваную ўсмешку і думаў, што, відаць, нялёгка проста вось так адкрыцца незнаёмаму. І калі ўжо адважваецца чалавек на такі крок, дык, мабыць, таму, што вельмі накіпела на сэрцы.

Марыя Адамаўна тады паўдня прасядзела ў рэдакцыі. Людзі ўваходзілі і выходзілі, а яна, усхваляваная сваім расказам, нічога не заўважала. Ды і я, прызнацца, быў узрушаны гэтай споведдзю.

...Калі вы паедзеце аўтобусам з Брэста ў Пінск, дык якраз на паўдарозе і будзе Антопаль — невялікае мястэчка, былы райцэнтр, а цяпер проста гарадскі пасёлак Драгічынскага раёна. Хоць пасёлак гарадскі, але ўсе тут ведаюць адзін аднаго, як кажуць, з пятага калена. Добра ведаюць і Тамару Пятроўну Загрэбу і Марыю Адамаўну Левановіч. Вось ужо амаль паўтара дзесятка гадоў яны працуюць у мясцовай бібліятэцы.

Як мне расказвалі ў Брэсце, Антопальская бібліятэка шмат гадоў лічылася адной з лепшых у вобласці. І раптам усё пайшло наперакос. Зараз сюды адна за другой едуць камісіі, каб адзначыць заняпад у рабоце. Ды так яно і ёсць. Мала хто ў Антопалі помніць, калі бібліятэка праводзіла апошнюю канферэнцыю чытачоў, з калгасаў ідуць скаргі, што перасталі працаваць кніжныя перасоўкі.

За масавую работу адказвае непасрэдна загадчыца бібліятэкі Т. Загрэба, за перасоўкі — М. Левановіч. Што ж здарылася? А здарылася тое, што вось ужо два гады жанчыны вядуць паміж сабой бязлітасную вайну.

Не буду стамляць чытача падрабязнасцямі гэтай сваркі, досыць брыдкай — яна нікому з іх не робіць гонару. Сёй-той у раёне даводзіў мне, што ўсё гэта, так сказаць, жаночы варыянт гогалеўскай гісторыі пра сварку Івана Іванавіча з Іванам Нікіфаравічам. Маўляў, бібліятэкарка нешта сказала на сваю загадчыцу і пачалося...

Спачатку і мне здалося так. Пакуль не пагутарыў з людзьмі, якія добра ведаюць і адну і другую. І адкрылася карціна, я б сказаў, нейкім чынам тыповая. Шкада толькі, што людзі, якія павінны былі ва ўсім разабрацца, не змаглі ці не захацелі гэтага зрабіць.

Два гады назад Марыя Адамаўна прывезла з Мінска інстытуцкі дыплом. Кожнаму, хто заходзіў у той дзень у бібліятэку, яна — не магла стрымацца — паказала невялічкую кніжку ў калейдаскопавай вокладцы. Аб гэтым шчаслівым дні марыла яна бяссонныя ночы, калі сядзела над кантрольнымі, рыхтавалася да экзаменаў. А было ж ой як цяжка вучыцца — на руках падлетак-сын (з мужам Марыя Адамаўна разышлася шмат гадоў назад), маці, бабулька, а карміцелька адна яна.

У Антопалі я разгаварыўся з пажылой настаўніцай Ганнай Георгіеўнай Міхеенка, дарэчы, актыўнай чытачкай бібліятэкі.

— Гэта ж мая былая вучаніца — Марыйка, так што ўсё яе жыццё на маіх вачах прайшло. Малайчына яна — упартая, працавітая, прамая, што думае, у вочы скажа. Зараз чалавек з вышэйшай адукацыяй, вядома ж, не рэдкасць. Але для Левановіч кончыць інстытут было сапраўдным подзвігам — яна ж хворая, з адным лёгкім жыве...

Ці не ў тыя дні і прабегла паміж ёй і загадчыцай бібліятэкі чорная кошка. Раптам пачала заўважаць Левановіч, што Тамару Пятроўну раздражняе кожны яе крок. Не-не, ды ўпікне, маўляў, што ты носішся са сваім дыпломам, я вунь без дыплома, дзякуй богу, заўсёды маю добры аўтарытэт.

Ей бы, Марыі Адамаўне, змоўчаць. Дык не, і яна па слова ў кішэню не палезла. І пайшло, і паехала. А тут, яшчэ чытачы прыйдуць і толькі да Левановіч звяртаюцца: «Марыйка, што вы параіце пачытаць?» або «Ох, Марыя Адамаўна, дзякуй за кнігу — усю ноч чытала». А Марыя Адамаўна ва ўсіх гэтых кнігах, як рыба ў вадзе — многа чытала, многа ведае. Тут жа, ля стала кнігавыдачы ўзнікае імправізаваная літаратурная дыскусія — расказваюць пра кнігі, чытаюць вершы, спрачаюцца.

Тамара Пятроўна побач, але — адна. Ведаюць, што загадчыца за ўсё жыццё прачытала мо дзесятак кніг. Відаць, не яе стыхія... А яе сяброўкі па рабоце не трацілі часу. Ці не таму яна цяпер так злуецца, калі бачыць, што чытачы хіляцца да Левановіч і другой бібліятэкаркі Любы Бобрык, ці не таму і цэдзіць праз зубы: «Во-о, паначыталіся раманаў...»

Такую карціну мне намалявалі многія з тых, з кім давялося гутарыць у Антопалі ды і ў раённым аддзеле культуры. Але лепш я буду строга дакументальны.

Л. Семянюк, дырэктар Антопальскага Дома культуры, сакратар партыйнай арганізацыі гарпасялковага Савета:

— Левановіч прыроджаны бібліятэкар. Для яе кніга — усё. Любіць яна кнігу і чытачам перадае гэту любоў. Усяго гэтага якраз і не хапае Загрэбе.

В. Самусёва, настаўніца Антопальскай сярэдняй школы:

— Магу толькі адно сказаць — хто-хто, а Левановіч на сваім месцы.

З. Міхеенка інструктар Антопальскага Дома культуры:

— Калі Загрэба ў бібліятэцы, то і заходзіць няма ахвоты. Яна, мабыць, лічыць, што бібліятэка, што той магазін — купіў мыла і пайшоў. Аднойчы я паспрабавала чытаць вершы ў бібліятэцы, дык Тамара Пятроўна ледзь не выпхнула мяне за дзверы.

С. Гарутка, сакратар Антопальскага гарпасялковага Савета:

— Левановіч я ведаю мо гадоў дваццаць. Працавітая жанчына. Якое грамадскае даручэнне ні дасі — разаб'ецца, а выканае, хоць і хворая вельмі.

Магу пад прысягай давесці, што ні з кім з гэтых людзей я раней знаёмы не быў. Я гэта для таго, што Тамара Пятроўна Загрэба, убачыўшы, з кім я гавару, зрабіла афіцыйны дэмарш, маўляў, усе яны падстаўныя асобы Левановіч, трэба каб я пагутарыў і «з яе людзьмі». (Чаго варта адно гэтае падзяленне чытачоў на «маіх» і «яе»).

А было так: я папрасіў бібліятэкара Любу Бобрык (Левановіч была ў адпачынку) падабраць мне некалькі найбольш актыўных чытачоў бібліятэкі. Але, аказалася, што і Бобрык з «лагера» Марыі Адамаўны.

Ну, што ж, на дэмарш трэба было рэагаваць. Мы заключылі з Загрэбай пагадненне, што я пагавару з першымі ж чытачамі, якія зараз зойдуць у бібліятэку. Імі аказаліся настаўнікі А. Козел і В. Багачук. Анатоль Данілавіч Козел тут жа мне паведаміў, што яму як выкладчыку літаратуры, Левановіч заўсёды аказвала вялікую дапамогу.

Няхай даруе мне чытач за такое скрупулёзнае пералічэнне ўсіх маіх субяседнікаў. Далей ён зразумее, чаму я не мог абысціся без гэтага.

...У бібліятэцы вайна разгаралася. Абедзве жанчыны аказаліся «на ўзроўні». Скажам, Загрэба піша дакладную на Левановіч у раённы аддзел культуры, дык тая — скаргу на загадчыцу ў абласное ўпраўленне культуры. Фіксіраваліся кожная прамашка, кожны няправільны крок, неасцярожнае слова.

Выязджае для праверкі прадстаўнік абласной бібліятэкі. Знаходзіць недахопы. Раённы аддзел культуры выносіць Загрэбе і Левановіч вымовы. Гэта было сёлета ў сакавіку. А праз два месяцы Левановіч атрымала суровую вымову з апошнім папярэджаннем. За што?

...Некаторы час назад у Антопаль прыехала перасоўная калона нафтавікоў. Што і казаць, у такім маленькім гарадку — гэта падзея. І мо не адно дзявочае сэрца моцна забілася, калі ішлі па вуліцы малайцы з асмужанымі, загарэлымі тварамі.

Адзін з іх пачаў часта заходзіць у бібліятэку. Быў гэта акуратны, прыстойны, вельмі ветлівы мужчына. Шмат чытаў, любіў расказваць аб прачытаным. Многія заўважылі, што прыходзіў ён толькі тады, калі дзяжурыла Левановіч. Э-э, не буду цягнуць... Марыі Адамаўне (цяпер вы разумееце, чаму імя і прозвішча яе ў гэтым артыкуле зменены?) здалося, што перад ёй чалавек, у якім спалучыліся рысы яе самых любімых герояў. Ёй здалося, што яна пакахала. Але каго! Жанатага. Была ў нашага Рамэо жонка (праўда, дзяцей не было). Зусім натуральна, што праз два дні жонцы стала ўсё вядома, і магчыма нават у дзесяць разоў больш, чым было на самай справе. У абласное ўпраўленне культуры на Марыю Адамаўну паляцела ананімка, у якой жанчыну аблівалі брудам, абвінавачвалі ва ўсіх смяротных грахах.

Дон Жуан наш, ці то адумаўся, ці то яшчэ па якіх прычынах перастаў прыходзіць у бібліятэку, і Марыя Адамаўна піша яму пісьмо. Пісьмо адразу ж трапіла да жонкі, якое яна тут жа занесла раённаму начальству. У гэты ж дзень прыйшла ў Драгічын для рэагавання і ананімка з Брэста. І заварылася такая каша, што Марыя Адамаўна за тыдзень пастарэла, мусіць, гадоў на дзесяць.

Яе выклікалі на пасяджэнне савета райаддзела культуры. Яна не паехала, бо захварэла. (Даведку аб хваробе потым пільна вывучалі, ці сапраўдная. Аказалася, што сапраўдная).

Праз колькі дзён савет аддзела ў поўным складзе разам з членамі мясцкома прафсаюза выехалі ў Антопаль, дзе і адбылося гістарычнае пасяджэнне, на якім Левановіч прыбілі да ганебнага слупа. Па асобных урыўках з успамінаў удзельнікаў гэтага пасяджэння зараз можна ўзнавіць карціну судзілішча. Перш-наперш загадчык аддзела культуры Адам Васільевіч Янусік зачытаў перад усімі ананімку і злашчаснае пісьмо Марыі Адамаўны.

— Левановіч паводзіла сябе вельмі дзіўна, — успамінае член мясцкома Надзежда Брухан. — Калі чыталі пісьмо, яна плакала, ускоквала, бегла некуды, ламала рукі...

— Во-во, ніякай павагі да савета, — дадае Адам Васільевіч, які прысутнічае пры гэтай размове.

Я пытаюся ў яго, ці не было яму сорамна?

— Каму — мне? — твар загадчыка выцягваецца ад здзіўлення.

— Вам не здаецца, што чытаць чужыя пісьмы непрыстойна?

Янусік пачынае ліхаманкава шукаць нешта ў шуфлядзе стала, вымае адтуль папку, дастае з яе некалькі спісаных лісткоў паперы.

— Во-о, паглядзіце толькі, што яна тут напісала...

Я адказваю, што ніколі ў жыцці не чытаў чужых пісьмаў, і гэтага правіла думаю трымацца і далей.

— Дык яно ж адрасавана жанатаму мужчыне!

— Усё роўна...

— Дык вы за распусту?

Вось тут, прызнацца, я крыху сумеўся. Баюся людзей, якім заўсёды ўсё ясна. На ўсё ў іх свая мерка, аб усім свая катэгарычная думка. Калі такі чалавек займаецца, скажам, прагнозам надвор'я, дык яшчэ паўбяды, а калі мае доступ, як кажуць, да сферы чалавечых адносін? Тады трымайся.

Аднойчы рэдакцыйная пошта прынесла пісьмо, аўтар якога патрабаваў закляйміць ганьбай нейкую жанчыну з яго вуліцы, якая, бачыце, кінула мужа і паехала з іншым. Той, іншы — п'яніца, прайдзісвет, а муж вельмі добры чалавек. «Многія ў нас гавораць,—пісаў аўтар,— што яна разлюбіла свайго мужа, таму і пайшла ад яго. Як гэта можна разлюбіць добрага, ціхага чалавека, і палюбіць п'яніцу?». Далей ішлі характарыстыкі жанчыны, ад якіх, не ведаю, як не пачырванела папера. Помню, я адпісаў аўтару, што нельга так проста лінейна, прымітыўна падыходзіць да ацэнкі чалавечых пачуццяў. І калі ўжо патрабуецца ўмяшанне, — дык тонкага скальпеля хірурга, а не сякеры дрывасека. Адным словам, банальныя ісціны, але аб іх, бачыце, даводзіцца напамінаць.

[Заканчэнне на 4-й стар.].

Нібы казачная чараўніца, схілілася над клавішамі дзяўчына. Адзін акорд, другі. І зноў—цішыня... Стараецца дзяўчына. Гэта лепшая рэгуліроўшчыца Барысаўскай фабрыкі, групкамсорг участка настройкі інструментаў Вольга Сураўцава. У тым, што слава пра барысаўскія піяніна даўно перайшла межы нашай рэспублікі, ёсць і яе заслуга.

Фота Ул. АДАРЫЧА.

ФІЛЬМ САЎГАСНЫХ КІНААМАТАРАЎ

Незвычайны фільм прагледзелі працаўнікі саўгаса «Тарнова». Яны ўбачылі на экране перадавікоў жніва і асенняй сяўбы, лепшых жывёлаводаў, пераможцаў конкурсу механізатараў сваёй гаспадаркі. Кадры кінакарціны добра адлюстроўваюць працоўны ўздым калектыву, яго поспехі на вахце ў гонар стагоддзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

Стваральнікі фільма — мясцовыя кінааматары на чале са старшынёй прафсаюзнага камітэта гаспадаркі А. Проніным.

БЕЛТА.

З полцы ЛіМа

УСЁ ПРА ВІЦЕБСКІ ТРАМВАЙ...

У 1898 годзе па вуліцах Віцебска пагрукатаў першы трамвай. Не многія гарады Расіі ў той час маглі пахваліцца электрычнай чыгункай. Аб вялікай і цікавай гісторыі віцебскага трамвая расказвае першы ў нашай краіне музей трамвая. Ён створаны зусім нядаўна, у 1965 годзе. Адным са стваральнікаў яго, а цяпер грамадскім дырэктарам з'яўляецца Леанід Аляксандравіч Забела.

У 1959 годзе ён устанавіў перапіску з ветэранамі працы, зацікавіўся кнігамі па гісторыі трамвайнага руху, многа працаваў у архівах. Паступова, год за годам, сабралася многа цікавых дакументаў, фатаграфій, макетаў. Яны і леглі ў аснову музея аб віцебскім трамваі.

Пачатак экспазіцыі расказвае аб задуме стварэння трамвая ў Віцебску... Вось дагавор паміж акцыянерным таварыствам «Віцебскі трамвай» і гарадской управай ад 4 лютага 1896 года. Пасля заключэння гэтага дагавору і пачалася пракладка пуцей. Усё будаўніцтва вялося пад кіраўніцтвам інжынера Рэзенталя. Першы трамвай прайшоў 14 ліпеня 1898 года. У гонар першага віцебскага трамвая кампазітар А. Крамер напісаў нават «Трамвайны марш». Фотакопія аднаго з экземпляраў гэтага маршу знаходзіцца ў экспазіцыі музея.

Першы віцебскі трамвай быў, вядома, далёкі ад сучаснага. Перад наведвальнікамі знаходзяцца макеты трамваяў, якія хадзілі ў горадзе: ад самага першага — маленькага, з незакрытымі платформамі — да сучасных паяздоў. У адной з вітрын — калекцыя грашовых знакаў, якімі расплачваліся пасажыры.

Многія экспанаты музея расказваюць аб цяжкіх умовах, у якіх працавалі трамвайшчыкі да рэвалюцыі, іх рабочы дзень працягваўся 16 гадзін. Не дзіўна, што рабочыя віцебскага трамвая былі аднымі з першых, хто стаў на шлях барацьбы супраць царызму. У лістападзе 1905 года яны стварылі свой прафсаюз. Яго арганізатарамі былі рабочыя Розман і Сяменаў, якія пазней прынялі актыўны ўдзел ва ўстанаўленні Савецкай улады ў Віцебску. Вялікую цікавасць уяўляе для наведвальнікаў арыгінал «Інструкцыі для вагонаважатых», выпушчанай у 1910 годзе акцыянерным таварыствам «Віцебскі трамвай».

Асобны стэнд расказвае аб станаўленні гарадскога трамвая пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тут жа ўзоры службовых пасведчанняў рабочых трамвайнага парка, матэрыялы аб будаўніцтве новых трамвайных пуцей. У 1934 годзе віцебляне ўпершыню атрымалі 4 вагоны айчыннай вытворчасці, якія ў канцы года былі пушчаны ў эксплуатацыю. Многа месца ўдзелена ў экспазіцыі рабочым дынастыям трамвайшчыкаў. К. Цымлякоў пачаў працаваць у Віцебскім трамвайным дэпо з 1898 года і працаваў да 1940 года. Яго дачка прыйшла ў трамвайны парк у 1933 годзе і несла эстафету бацькі да 1959 года.

Асабліва вялікую цікавасць выклікаюць у наведвальнікаў дакументы аб залічэнні У. І. Леніна ганаровым машыністам віцебскай гарадской электрастанцыі. Тут прадстаўлены фотакопія справы « Аб службе Леніна Уладзіміра Ільіча. Пачата 18 чэрвеня 1923 года. Закончана 21 студзеня 1924 года», тэлеграмы вялікаму правадыру ад рабочых камунальнай гаспадаркі Віцебска.

Сярод экспанатаў музея ёсць рад фатаграфій, якія расказваюць аб мастацкай самадзейнасці трамвайшчыкаў, іх драматычны гурток ставіў п'есы «Лес» і «Без віны вінаватыя» М. Астроўскага, «Любоў Яравая» К. Тренёва, «Чужое дзіця» Шкваркіна і карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод жыхароў горада. Апрача драматычнага гуртка пры клубе трамвайшчыкаў, працавалі танцавальны, харавы, духавы, фізкультурны гурткі. Фізкультурнікі паказвалі свае мастэрства ў час фізкультурнага параду ў Віцебску ў 1933 годзе, які прымаў С. М. Будзённы.

У 1968 годзе віцебскаму трамваю споўнілася 70 гадоў.

Музей віцебскага трамвая прысвечаны адной з цікавейшых старонак гісторыі горада на Дзвіне. Можа ёсць сэнс зрабіць гэты музей філіялам краязнаўчага музея? У гэтым выпадку з цікавым музеем аб гісторыі віцебскага трамвая зможа пазнаёміцца многа людзей, яго можна будзе паказаць і гасцям горада.

А. ПАДЛІПСКІ.
г. Віцебск.

НАВІНКІ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

Малюнкі Ю. Пучынскага да кнігі Г. Васілеўскай «Я еду на вярблюдзе», якая рыхтуецца да выдання ў выдавецтве «Беларусь».

Сярод кніг

КРАСА І ВЕЛІЧ СЛОВА СКАРЫНАВАГА

КАЛІ чатыры з паловай стагоддзі назад «у старым месце Пражскім» выйшла першая ўсходнеславянская друкаваная кніжка і выдавец яе з высокай годнасцю падпісаў: «...я, Францыск, Скорынін сын с Полоцька, в лекарских науках доктор, повелел есми Псалтырю тиснути рускими словами а словенским языком... к пожитку посполитого доброго, наболей с тое причины, иже мя милостивый бог с того языка на свет пустил...», калі «працею и выкладом избранного мужа» выходзілі адна за другой «богу ко чти и людем посполитым к научению» наступныя скарынавы кнігі; калі разважаў ён аб прызначэнні гэтых кніг і аб ролі іх у жыцці грамадства; калі рупіўся ён аб асвеце роднага свайго народа; калі давяраў друкаванаму слову — упершыню друкаванаму на ўсходнеславянскіх землях! — свае запаветныя думкі і мары аб волі народнай і аб справядлівасці, аб сэнсе і змесце жыцця, аб карысці ведаў, аб правільным выхаванні і аб чалавечай маралі, аб вытоках патрыятызму і аб усведамленні нацыянальнай прыналежнасці; калі з незвычайнай дбайнасцю апрацоўваў і аздабляў на ўзроўні лепшых сусветных узораў свае кнігі; калі падшукваў дасціпныя і трапныя выразы і словы замест тых, што «нерозумныи простым людем», — ці думаў тады наш вялікі продак аб несмяротнай будучыні сваёй вялікай справы? Магчыма, думаў. Ён шмат ведаў, глыбока разумеў, задумваў шырока, рабіў сваю пачэсную справу з незвычайным энтузіязмам. І кожны раз з гонарам называў сваё імя, родны горад і мову, з якою ўзрос. І праз чатыры з паловай стагоддзі не засталася безыменнай яго спадчына, а яго імя авеяна пашанай і гордасцю на Беларусі і ва ўсім славянскім свеце.

Дзякуючы шматгадовым даследаванням скарыназнаўцаў, мы сёння можам поўна і рознабакова ўяўляць гістарычную ролю і грамадскае значэнне дзейнасці Скарыны для ўсёй нашай культуры і асобных яе галін.

Але на шляху вывучэння скарынавай спадчыны да нядаўняга часу была надзвычай істотная перашкода. Скарынінскія выданні належаць да самых каштоўных бібліяграфічных рэдкасцей, ніводнае кнігасховішча краіны не мае іх поўнага камплекту, таму нават для спецыялістаў яны заставаліся практычна маладаступнымі.

І вось — у скарынаназнаўцаў і ва ўсіх, хто зацікаўлены роднай культурай і яе гісторыяй — свята: выдавецтва «Навука і тэхніка» выпусціла пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР В. Барысенкі «Прадмовы і пасляслоўі» Францыска Скарыны, упершыню поўнасцю апублікаваўшы літаратурна-публіцыстычную спадчыну нашага першадрукара.

Складальнік кнігі А. Коршунаў прарабіў надзвычай карпатлівую і складаную работу, абследаваўшы і сістэматызаваўшы ўсе вядомыя скарынінскія выданні, што захоўваюцца ў кнігасховішчах СССР. Пра аб'ём і змест гэтай работы мы можам меркаваць па дзвюх грунтоўных і надзвычай важных працах складальніка, змешчаных у дадатку: «Літаратурна-публіцыстычная спадчына Францыска Скарыны» і «Кароткі каментарый да выданняў Францыска Скарыны».

Абодва гэтыя даследаванні, скажам не перабольшваючы, вялікая падзея ў скарынаназнаўстве. А. Коршунаў, абапіраючыся на дасягненні сучаснага скарынаназнаўства, навукова-абгрунтавана разглядае выдавецкую дзейнасць Скарыны з пункту гледжання структуры і паслядоўнасці выдання «Бібліі», вызначае месца кожнай кнігі ў скарынінскай класіфікацыі па гнёздах і — што асабліва важна — **упершыню** каменціруе і супастаўляе **усе** выданні, якія захоўваюцца ў нашай краіне, даючы звесткі пра месца захоўвання (з бібліятэчным шыфрам), пра ступень захаванасці, нават пра асобныя паметы чытачоў і былых уладальнікаў, а таксама дае сціслыя характарыстыкі выяўленча-мастацкіх і некаторых іншых асаблівасцей гэтых кніг. Паказвае ён і тыя крыніцы, з якіх браліся публікацыі для дадзенай кнігі.

Цяпер вучоны-скарыназнаўца, гісторык, літаратар, мовазнаўца і кожны, хто цікавіцца Скарынай, можа вывучаць яго публіцыстыку па гэтым выданні. Зазначым толькі, што мовазнаўцам пашанцавала менш: пунктуацыя і часткова графіка і правапіс тэкстаў Скарыны прыведзены ў кнізе ў адпаведнасць з сучаснымі моўнымі нормамі. Не абышлося, на жаль, і без друкарскіх памылак.

У кнізе змешчаны артыкул М. Прашковіча «Францыск Скарына», у якім даецца сціслая, але змястоўная характарыстыка прадмоў і пасляслоўяў Скарыны ў цеснай сувязі з усёй яго выдавецкай дзейнасцю, вызначаецца іх сувязь з надзённымі для тагачаснага грамадска-палітычнага і культурнага развіцця Беларусі пытаннямі. Аддаючы належнае і самастойнасці поглядаў даследчыка, і яго захопленасці прадметам гаворкі, мусім усё ж зрабіць некалькі заўваг.

З артыкула вынікае, што М. Прашковіч лічыць зусім вырашаным пытанне аб мове выданняў Скарыны. «Паказальным з'яўляецца тое, што Скарына выдаваў кнігі не на старарасславянскай, а на тагачаснай беларускай мове...», — піша ён у артыкуле. І далей паўтарае: «Ёсць слушныя меркаванні, што Скарына пераклаў на беларускую мову ўсю «Біблію»...»; «выданне Скарынай кніг на беларускай мове» і г. д. Аднак сучаснае мовазнаўства пазбягае такіх катэгарычных сцвярджэнняў. Зазначаецца, звычайна, што і да нашага часу сярод вучоных няма адзінства ў ацэнцы мовы выданняў Скарыны як з боку структуры, так і з боку функцыянальнай яе ролі: гаворка ідзе галоўным чынам пра шырокае адлюстраванне рыс жывой народнай мовы, беларускіх моўных асаблівасцей у скарынінскіх тэкстах або пра «беларускі тып кніжна-славянскай мовы», пра «беларускі моўны каларыт» (спашлёмся на І том «Гісторыі беларускай літаратурнай мовы» А. Жураўскага і на артыкулы Л. Шакуна, А. Жураўскага і М. Булахава ў кнізе «450 год беларускага кнігадрукавання»). Бясспрэчна ж гаворыцца менавіта аб **царкоўнаславянскай** аснове, у якую ўводзілася народная гаворка. «Увогуле архаічнай мовай, насычанай царкоўнаславянскімі формамі і словамі, напісаны яго ўласныя творы — прадмовы і пасляслоўі»,— такі вывад вядомага даследчыка гісторыі беларускай літаратурнай мовы Л. Шакуна. Дарэчы, становіцца няясным таксама, што разумее М. Прашковіч пад тагачаснай беларускай мовай, калі атаясамляе яе з мовай скарынінскіх кніг.

Гістарычныя прычыны і мэта выдання «Бібліі» ў артыкуле М. Прашковіча растлумачаны ўвогуле добра. Аднак асобныя выказванні аўтара вызначаюцца недакладнасцю. Ён, напрыклад, пярэчыць сам сабе, калі піша: «Каб выхаваць у сваіх чытачоў любоў да радзімы, ён (Скарына.—**Л. К.**) выкарыстоўваў нават (?) біблейскія кнігі». Ці вось як піша даследчык пра палітычныя погляды Скарыны: «Яго ідэалам была антычная дэмакратыя, дзяржава з мудрым, справядлівым і асвечаным манархам...». Антычная дэмакратыя... з манархам? Нешта, мабыць, не тое. Да таго ж, антычная дэмакратыя па сваёй класавай сутнасці была дэмакратыяй для рабаўладальнікаў, і Скарыну (дэмакратызм якога падкрэслівае сам жа М. Прашковіч) маглі прывабіць толькі некаторыя бакі такой формы праўлення.

Несумненная вартасць артыкула М. Прашковіча ў тым, што ён абапіраецца на ўсе скарынінскія тэксты. Адсюль — асаблівая перакананасць тых мясцін, дзе даследчык гаворыць пра патрыятызм Скарыны, пра яго ўсвядомленае імкненне служыць свайму беларускаму народу. Але і тут хочацца ўдакладніць і пашырыць асобныя думкі даследчыка.

Скарына ў артыкуле пададзены, як нам здаецца, у арэоле поўнай выключнасці. Але ў нас ёсць падставы меркаваць, што ў беларускага першадрукара былі паплечнікі і аднадумцы. Імі, пэўна, былі невядомыя мастакі — ілюстратары яго «Бібліі», і яе друкары, а таксама члены віленскіх праваслаўных брацтваў, якія спачувалі і дапамагалі Скарыне. А хіба не была роднаснай па сваім гуманістычным змесце скарынінскаму патрыятызму палымяная любоў да роднага краю яго сучасніка і суайчынніка Міколы Гусоўскага, бліскуча выказаная ў «Песні пра зубра», хіба не яднаў іх адзін і той жа клопат:

Стогне і ў цемрадзі ночы
злавесная народ наш,
Вобмацкам долі шукае.
Жахлівыя здзекі
Церпіць пакутнік пад
страшным прыгнётам
чужынцаў.
Мы — шчэ натоўп,
грамада непісьменная,
цемра.
Вы не зайздросьце
становішчу нашаму,
людцы.
Князь і баяры—усе,
каму льга заступіцца,
Глухі да нас і не горай,
чым жорсткі татарын.
Тушаць малейшы агеньчык
нязгоды ў народзе...

Ці не аб тым жа рупіўся і Скарына, які задаўся мэтай далучыць свой народ да ведаў, даць яму грамату, абудзіць яго грамадзянскія пачуцці.

Звычайна ў размове пра літаратурна - публіцыстычную спадчыну Скарыны шмат увагі аддаецца яе ідэйнаму зместу. Значна менш гаворыцца, на жаль, пра эстэтычную змястоўнасць мудрага слова Скарыны. А між тым...

Форма твораў Скарыны — бліскучая. Прадмовы і пасляслоўі — выдатная мастацкая з'ява. Яны здзіўляюць не толькі сваімі высокімі мастацкімі вартасцямі (абавязкова скажам і пра гэта), але і арганічнай адпаведнасцю формы тым задачам, якія ставіў перад сабой выдатны асветнік і гуманіст.

Захапляе выключная мэтанакіраванасць публіцыстыкі Скарыны. Адрасуючы свае выданні не царкве, не манарху, не «вярхам» і не адзінкавым вучоным, а шырокім колам простых людзей, асветнік суправаджае іх адпаведнымі прадслоўямі, разлічанымі іменна на маладасведчаных чытачоў. Сярод іх ён спадзяецца знайсці разуменне і спачуванне. Выказваючы ім свае запаветныя думкі і клопаты, Скарына імкнецца абудзіць іх свядомасць, іх волю да дзейнасці, выхаваць аднадумцаў.

Кампазіцыя і стыль прадмоў абумоўлены агульнай задумай, пастаўленай мэтай. Адчуваецца, што форма звароту да чытача глыбока прадумана і прачута аўтарам. Яго прадмовы і «сказанні» ўспрымаюцца як жывая гутарка ўмудронага настаўніка, які шчыра любіць сваіх вучняў і з вялікай даходлівасцю пераказвае біблейскія кнігі — сціслa, трапна, дасціпна высвятляючы іх змест і сэнс, дапаўняючы іх сваімі развагамі і парадамі. Імкнучыся падрыхтаваць чытача да свядомага засваення зместу, Скарына акцэнтуе галоўнае ў ім, вытлумачвае незразумелыя мясціны, дае неабходны гістарычны ці літаратурны каментарый.

Яго ўласныя творы — узоры таго, як «в так... малой книзе» выказаць «краткыми словы» вялікую мудрасць, сказаць аб той ці іншай з'яве проста, пераканаўча і выразна. Так, у «Предъсловии во всю бивлию» ўсяго на некалькіх старонках Скарына растлумачыў слова «біблія», сказаў аб змесце бібліі і падзеле яе на кнігі, аддзяліў ад «святога писма» сем «наук вызволеных», даў паняцце аб навуках «словесных», расказаў, якія веды можна набыць, чытаючы біблейскія кнігі, коратка ахарактарызаваў кожную з іх, абгрунтаваў свае думкі цытатамі.

За простымі словамі тлумачэнняў увесь час адчуваецца шчырасць, страсная ўсхваляванасць, якая нярэдка вызначае танальнасць тэксту: мова Скарыны, захоўваючы ўласцівую ёй прастату, становіцца вобразнай і ўзнёслай. Гэта асабліва прыкметна, калі асветнік разважае пра тое, што найбольш дорага яму: пра мудрыя кнігі (яны «есть зерцало жития нашего, лекарство душевное», «пожиточны... всякому человеку, мудрому и безумному, богатому и вбогому, младому и старому, наболей тым, они же хотять имети добрые обычае и познати мудрость и науку»), пра святло навуковых ведаў («яко свет превышает над темности тако и мудрый над глупаго. Мудрый имать очи во главе своей, а глупый во тме ходить»), пра справядлівасць («дарове ослепяють очи мудрых людей и зменяють слова справедливых»).

І да якіх вяршынь уздымаецца яго слова! Скарына ведаў законы красамоўства і валодаў імі з дасканаласцю майстра. Выразны і гнуткі яго сінтаксіс, то па-дзелавому лаканічны, то ўскладнёны сілагізмамі, разважаннямі — складаны, разгалінаваны, шматструктурны, то ўзнесены рытмамі паўтораў і ўзмацненняў да высокай патэтыкі: «...псалмы, якобы сокровище всих драгых скарбов, всякии немощи, духовныи и телесныи, уздравляють, душу и смыслы освещають, гнев и ярость усмиряють, мир и покой чинять, смуток и печаль отгоняють, чювствіе в молитвах дають, людей в приязнь зводять, ласку и милость укрепляють, бесы изгоняють, ангелы на помощь призывають».

Вельмі багатая ў яго сінаніміка: «В ней воистину ест дух разумности святый, единый, различный, смысленый, скромный, вымовный, движущийся, непоскверненый, истинный, сладкий, чистый, сталый, добротливый и всякую иную имеющий в себе добрую цноту».

Кожнае слова ўзважана сэнсам і праверана сэрцам, яно стаіць на тым адзіным месцы, якога вымагаюць і сэнс, і змест, і рытм фразы.

Лёгка ўваходзіць у скарынінскія перыяды жывая народная фразеалогія, беларускія словы бяруцца ім несумненна з народнай мовы, і не толькі дзеля даступнасці, але і для акрасы выслоўя. Можна смела сказаць, што ў яго творчасці не толькі «пашыраліся выяўленчыя магчымасці літаратурнай мовы за кошт смелага, некалькі незвычайнага спалучэння элементаў рознага паходжання — кніжна-славянскіх і народна-гутарковых» (Л. Шакун), але і з гонарам прайшлі выпрабаванне ў вельмі дасканалай эстэтычнай сістэме шматлікія беларускія словы — беларускія па паходжанні, па моўнай традыцыі, па фанетычнай афарбоўцы, па словаўтварэнні.

Скарына-гуманіст не толькі высока ўзносіў вартасць чалавечай асобы, ён сцвярджаў яе і як прадмет мастацкага пазнання, яму мроіўся ідэал усебакова развітага чалавека дасканаласці: «Да совершен будет человек божий и на всяко дело добро уготован». А чалавек для Скарыны быў не абстракцыяй, а зусім рэальным чалавекам — «простым» суайчыннікам, якому нестае ведаў, каб стаць свядомым сынам бацькаўшчыны, членам грамадства і ўладаваць жыццём на прынцыпах справядлівасці і дабра.

Скарына смела абыходзіўся з біблейскімі тэкстамі. Узбройваючыся «Бібліяй», ён крыў з «царскага права» як з несправядлівага, грабежніцкага, антынароднага. Насуперак хрысціянскаму вучэнню ён сцвярджаў справядлівасць адпору гвалту сілай. Ён, вядома, як сын свайго часу, не мог узняцца да поўнага адмаўлення феадальных парадкаў, але настойліва сцвярджаў, што нельга «обращати ко злому моцы свое превеликое».

Скарына крытычна ставіўся і да самога свяшчэннага пісання. Ён праяраў яго логікай дасведчанага чалавечага розуму. Тлумачэнне «царства нябеснага» як «зямлі жывых» — ці не палемічнае яно ў дачыненні да царкоўных догмаў? І ці не ўладкаваную справядлівасцю зямлю лічыць ён «царствам нябесным»? Скарына звяртаў увагу сваіх чытачоў на некаторыя недарэчнасці ў «Бібліі». Так, у «Предъсловии во всю бивлию» ён, гаворачы, што ў «Книгах Иисуса Навина» і «Книгах Царств» маюцца астранамічныя звесткі, лічыць неабходным адзначыць: «Более воистинну чудитися превеликой божией моци мусиш, нижли учитися». Важка гучыць і, здаецца, не без адцення іроніі.

Але — не ахапіць усяго, што становіцца відочным і выразным пасля выхаду кнігі «Прадмовы і пасляслоўі» Ф. Скарыны. Застаецца толькі пашкадаваць, што скарынінскія ілюстрацыі пададзены ў кнізе не ўсе і не ў колерах, што яны адрэзаны ад загалоўкаў, што кніга выдадзена мізэрным тыражом (яна імгненна была раскуплена, не задаволіўшы значнай часткі вялікага попыту на яе).

Як гэта сімвалічна: кніга, на якой значыцца аўтарам Францыск Скарына, выйшла ў друкарні імя Францыска Скарыны. Нам заўсёды будзе патрэбна велічная спадчына слыннага нашага першадрукара. Ён «избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и паметь свою...»

Л. КАРОТКАЯ,
кандыдат філалагічных навук.

Францыск Скарына. «Прадмовы і пасляслоўі». Выдавецтва «Навука і тэхніка». Мінск, 1969.

Віцебск сёння. Выгляд на вуліцу Кірава з боку моста.
Фота Г. УСЛАМАВА. (БЕЛТА).

ТЭМА ГАВОРКІ— «ПЕРШАЯ КНІГА ПАЭТА»

Вось ужо амаль два гады ў выдавецтве «Беларусь» выходзяць у свет тоненькія, сціплыя кніжачкі, на папяровых вокладках якіх, поруч з партрэцікам аўтара, значыцца: «Першая кніга паэта». За гэты час выйшла іх паўтара дзесятка.

Менавіта аб гэтай серыі кніг, аб ідэйна-мастацкай вартасці тых з іх, якія ўжо выйшлі, а таксама аб тым, што трэба зрабіць, каб наступныя першыя кніжкі паэтаў былі лепшымі, і ішла гаворка на чарговым пасяджэнні секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР, якое адбылося ў панядзелак, 22 верасня.

Серыя «Першая кніга паэта» адразу знайшла прызнанне чытача: амаль ніводны зборнічак не залежыўся на прылаўках кнігарань. Гэтая серыя — красамоўнае сведчанне росту нашай паэзіі, яе бурнага развіцця ў апошнія гады, сведчанне таго, што ў беларускую паэзію штогод уліваюцца новыя сілы і таленты.

«Мора мары» Уладзіміра Аляхновіча, «Раўнавага» Сымона Блатуна, «Свежасць» Яўгена Вераб'я, «Гром на зялёнае голле» Юркі Голуба, «Раніца» Вольгі Іпатавай, «Восеньскія позвы» Казіміра Камейшы, «Млечны шлях» Міхася Казакова, «Святло зоркі» Мікалая Капанёва, «Салаўі» Яўгена Крупенькі, «Хай не паміраюць зоркі» Леаніда Рашкоўскага, «Вернасць» Віктара Ракава, «Леснічоўка» Рыгора Семашкевіча, «Дарога» Эдуарда Скобелева, «Зямля — магніт» Міколы Федзюковіча, «Камень, які спявае» Мацвея Яцука... Кнігі гэтыя не падобныя адна на адну, як непадобныя адзін на аднаго і іх аўтары. І ўсё ж у першых кніжках паэтаў шмат і агульнага — як з дадатнага, так і з адмоўнага боку.

Падабенства іх ужо ў тым, што гэта — першыя кнігі, своеасаблівыя заяўкі, пуцёўкі паэтычнай моладзі ў вялікае творчае жыццё. Першыя кнігі паэтаў прываблываюць маладосцю і свежасцю настрояў і пачуццяў, шчырасцю і сардэчнасцю інтанацый, спробамі сказаць нешта сваё, уласнае пра сябе і сваіх аднагодкаў, спробамі па-свойму асэнсаваць падзеі далёкай і блізкай гісторыі, вывяліць сувязь і пераемнасць традыцый і пакаленняў. Сімптаматычна і жаданне маладых сцвердзіць у вершах сябе як асобу, як чалавека і грамадзяніна.

Урэшце, агульнае для кніжак серыі і тое, што амаль усе яны вылучаюцца даволі высокім узроўнем паэтычнай культуры, а дакладней, даволі высокім узроўнем версіфікатарскага ўмельства.

З другога боку, першым кніжкам паэтаў уласцівы і аднолькавыя — у многім — недахопы. Галоўны з іх — дробнатэм'е, дробязнасць думкі і пачуцця, што абумоўлена, відаць, небагатым душэўным і жыццёвым вопытам маладых аўтараў. Далей. Амаль усе зборнікі беднаватыя ў тэматычных адносінах. Маладыя паэты, нібы згаварыўшыся, пішуць аб адным і тым жа: аб дзяцінстве, аб роднай вёсачцы, рачулцы ці возеры, аб сваіх рэдкіх наездах у родныя мясціны, аб студэнцкіх гадах, каханні і яшчэ аб тым-сім. А вось спроб гаворкі аб нечым больш істотным, больш важным, аб тым, чым жыве наш народ, наша краіна, што хвалюе сёння чалавецтва,—такіх спроб малавата. У вершах быццам і ёсць хваляванне, і туга, і радасць, і боль, але занадта часта гэтыя пачуцці надуманыя, народжаныя не ў сэрцы паэта, а на паперы. Сапраўднага ж чалавечага болю, гневу, радасці, узрушанасці ў вершах маладых, на жаль, малавата. Найбольш, чаго бракуе аўтарам першых кніжак, гэта ўмельства думаць, шукаць і знаходзіць адказы на пытанні, якія штодня ставіць жыццё і час.

Бедныя кніжкі серыі і ў жанравых адносінах. Не вельмі смелыя маладыя паэты і ў пошуках формы. У выніку першыя іх кніжкі даволі адностайныя па рытмічным і музычным гучанні сабраных у іх твораў. Зашмат у вершах маладых літаратуршчыны, гатовых штампаў і звычных, так званых дзяжурных выразаў і вобразаў.

Засмучаюць і шматлікія моўныя агрэхі і неахайнасці, якіх таксама нямала на старонках першых кніг. Маладыя паэты падчас не ўмеюць выказваць свае думкі і пачуцці трапна і дакладна, увогуле часам выяўляюць глухасць да лексічнага напаўнення слова, да яго эмацыянальнага і меладычнага гучання. Нярэдкія ў зборніках маладых і пралікі густу.

Прычыны гэтых недахопаў — у непатрабавальнасці саміх аўтараў першых кніжак, у паблажлівасці выдавецкіх работнікаў. Рэдагаванне першай кнігі паэта — справа надзвычай цяжкая і адказная. Да гэтай работы трэба прыцягваць найбольш вопытных, сталых майстроў паэтычнага слова. Сумесная работа над кнігай вопытнага рэдактара і маладога паэта прынясе карысць і самому аўтару першай кнігі і, безумоўна, чытачу. Добра было б, калі б першая кніжка, перш чым трапіць у выдавецтва, стала прадметам абмеркавання паэтычнай секцыі Саюза пісьменнікаў.

Варта таксама падумаць над палепшаннем і знешняга выгляду кніжак серыі. Бо пакуль што іх афармленне і паліграфічнае выкананне занадта беднае, шэрае, будзённае.

Серыя «Першая кніга паэта», нягледзячы на пэўныя выдаткі, ўсё ж пацвердзіла сваё права на далейшае існаванне. Трэба спадзявацца, што яна будзе выходзіць і надалей, што наступныя яе кніжкі, дзякуючы сумесным клопатам і ўвазе выдавецтва, Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку і Саюза пісьменнікаў, будуць лепшымі ва ўсіх адносінах.

У гаворцы пра ўсё гэта прынялі ўдзел Рыгор Барадулін, Алесь Бачыла, Ніл Гілевіч, Сяргей Грахоўскі, Хведар Жычка, Еўдакія Лось, Пімен Панчанка, Анатоль Сербантовіч, Янка Сіпакоў, Кастусь Цвірка, Станіслаў Шушкевіч, галоўны рэдактар Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку У. Яцко.

ГЕРОІ ФІЛЬМА— СПАРТСМЕНЫ «КОЛАСА»

Калгас імя Калініна Пінскага раёна добра вядомы ў рэспубліцы. Добрая слава ідзе і аб калгасным спартыўным клубе «Колас». Спартсмены клуба на розных спаборніцтвах заваявалі больш двух дзесяткаў кубкаў і прызоў, залатых медаляў. А футбольная каманда калгаса з'яўляецца пяцікратным уладальнікам кубка абласной газеты «Зара» і кубка «Сельской газеты».

У гэтыя дні ў калгасе знаходзіцца група работнікаў Цэнтральнага тэлебачання, якая здымае тут дакументальны фільм аб спартсменах з «Коласа». Гледачы пазнаёмяцца са спартыўным комплексам, які зроблены па праекце старшыні калгаса, убачаць стадыён, будуць «балельшчыкамі» спаборніцтваў. Ужо знята на плёнку вялікае свята фізкультурнікаў, прысвечанае заканчэнню ўборкі ўраджаю і пачатку навучальнага года ў школах.

Здымкі фільма працягваюцца.

М. ПРЫГОДЗІЧ.

Пьеса Аляксандра Петрашкевіча «Адкуль грэх?..» была адзначана прэміяй на рэспубліканскім конкурсе на лепшую п'есу. Гэта — драматургічны дэбют аўтара, навуковага работніка, кандыдата гістарычных навук. Цяпер п'есу рыхтуе да пастаноўкі Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Гэты здымак зроблены на адной з рэпетыцый. Пастаноўшчык спектакля народны артыст СССР П. Малчанаў (стаіць) і выканаўцы роляў абмяркоўваюць музыку, напісаную да спектакля кампазітарам заслужаным дзеячом мастацтваў БССР Г. Вагнерам (ля раяля).

Фота Ул. КРУКА.

Паэтычная ПАВЕРКА

Аляксей ЗАРЫЦКІ

НА ЧЫРВОНАЙ ПЛОШЧЫ

I

Гэта плошча надзея мая і закон.
Крочу зноў я паволі да сцен
Маўзалея.
Да яго ўпершыню я прыйшоў
юнаком,
А цяпер пасівеў я, нібыта завея.

Ідучы, расхінаю душу,
Хай святло
Нашай праўды высокай,
Як ужо не аднойчы,
Скрозь праверыць яе,
Каб не сорам было
Мне Уладзіміру Ільічу
Глянуць у вочы.

II

Чырвоная плошча,
Ты порахам пахла калісь і свінцом,
Каціліся цераз цябе
Рэвалюцыі хвалі.
Тут Ленін руку прыўзнімаў
Над палкамі бяссмертных байцоў.
Тут мы Перамогу
Каля Маўзалея віталі.

Чырвоная плошча,
Прыходжу я часта і ўдзень,
і ўначы
Пад зоры твае,
Прыходжу я ўвечар, і рана.
Падоўгу я слухаю музыку,
Што над табою гучыць,
Гучыць над свяшчэнным каменнем
тваім
Несціхана.

Я повен увесь
Уладарным гучаннем яе маладым,
Нястрымна яе раскаваныя рэкі
ліюцца.
Мо гэта Кастрычніка музыка
ў сэрцы маім
Зліваецца з музыкай новых,
Блізкіх ужо, рэвалюцый!!

ЛЕПШАЯ ВУЛІЦА

Нарадзіўся я ў Хоцімску, —
Колісь глуш-глухмень,
За барамі дрымучымі,
За гаямі далёкімі, —
Лесуны ў навакольных пушчах
галёкалі
Ад нудоты і ноч і дзень.

Барабанаўка — вулка,
Дзе, як настырнае зерне,
Я ўзышоў на забытай усімі зямлі,
Належала Смаленскай губерні,
А суседнія вулічкі ўжо
Магілёўскай былі.

Белая Русь так блізка-блізка,
І Вялікая тут—не чужынай-чужой.
Над самай-самай мяжой
Калыхалася мая калыска:
То з Расіі ды ў Беларусь,
То ў Расію ды з Беларусі.
Змалку лёг я на правільны курс
І з яго, відаць, не саб'юся.

Барабанаўка — лепшая вуліца!
Будзеш ты да магілы мне
помніцца.
Да цябе і дагэтуль душа мая
туліцца,
Маё сэрца дзядоўскае горнецца.

ПЯРЭЧАННЕ

Палякі гавораць, што «вжэсень
Юж есень».
Аднак я хачу запярэчыць ім,
Бо верасень — восень
Усё ж у двукоссі,
Дакладней гаворачы — восень,
Але не зусім.
Наш верасень — гэта часіна,
Калі яшчэ лета не страціла сілу,
Калі яшчэ маці-зямля і не сніла
Завейную сівую мітульгу,
Калі толькі раніні іней
Ды колер нябёс зябкавата-сіні
Зімовых начэй прадракаюць тугу.
Я гэта пацвердзіць заўсёды гатоў.
Таксама: паўсотні гадоў —
Яшчэ аніяк не старасць.
Гэта проста сапраўдная сталасць,
Гэта крыві палымяная аласць.
Гэта ў марах крылатая смеласць
Гэта ў справах майстэрская
ўмеласць.
Гэта ў развагах мудрая спеласць.
Няхай жа на скроні твае
Іней,
Уздыхам яшчэ няблізкага снежня
кладзецца.
Сум дазволен,
Але
Лёгенькі-лёгенькі,
Як павуцінне,
Якое над гонямі ў верасні ўецца.

ЗА ПАРОГ

Згрызотніца-скруха стаіць ля
парога:
Пакрыўдзіўся друг,
Пайшоў...
Як сабутэльнікаў многа,
Як мала сяброў.

Туды, за парог,
Маё сэрца рвецца:
А можа друг азірнецца!

Цырк

СЛАНОВАЯ ГРАЦЫЯ... БЕЗ ДВУКОССЯ!

Па вечарах на франтоне будынка Мінскага цырка загараецца слова «Аэрас». Гастролямі гасцей з ГДР 6 верасня тут адкрыўся новы сезон.

...Гучыць музыка, адчыняюцца малінавыя аксамітныя вароты — прадстаўленне пачалося!

Пасля параду-пралогу — на манежы імклівыя акрабаты-скакуны Самара. Артысты працуюць хутка і спрытна. Іх кампактны, дынамічны нумар як бы вызначае тэмп прадстаўлення.

Рассыпалася жывая піраміда — і вось другі выхад. У крузе шатландскія поні. У цэнтры дрэсіроўшчык у нацыянальным шатландскім касцюме. Аркестр імітуе гучанне шатландскай валынкі. Поні ходзяць пад сядлом. А ў сёдлах — маленькія жакеі-малпачкі. Асабліва забаўны чацвёрты «жакей»: вясёлы, гарэзлівы, здаецца, вось-вось выпадзе з сядла. Нумар афарбаваны мяккім гумарам, які так добра пасуе да характару маленькіх конікаў. Ён выклікае ва ўсіх добрую ўсмешку і запамінаецца сваёй чароўнасцю.

Першае знаёмства з выдатным дрэсіроўшчыкам коней Хельмутам Рудатам адбылося. Пазней мы яшчэ двойчы сустракаемся з ім. Разам з жонкаю Ірмгард і дачкой Мануэлай Хельмут Рудат дэманструе класічную выездку, а ў завяршэнне праграмы яго грывастыя выхаванцы здзіўляюць нас выключнай дакладнасцю і чоткасцю ў кампазіцыях і перастраеннях. Іншы раз нават здаецца, што ў нумары відны не замацаваныя дрэсурай умоўныя рэфлексы, а свядомыя адносіны да прапанаванай задачы.

У Хельмута Рудата коні такія прыгожыя, што, здаецца, выпусці іх проста на манеж, дай ім поўную волю—і вачэй не адарвеш. А як лёгка і чыста выконваюць яны розныя трукі! Вось толькі эпізод са скакалкай, здаецца, не дасягае мэты. Відаць, гэта складана — навучыць каня скакаць праз вяроўку. Але калі вараны прыгажун, падскочыўшы, камічна падкідвае заднія ногі, у нечым траціцца годнасць высакароднага каня. Ён проста па сваёй прыродзе не прыгодны ў «комікі».

У праграме цырка «Аэрас» дрэсіраваныя жывёлы займаюць многа месца. Калі вы хочаце зразумець, што тоіцца за словамі «слановая грацыя», прыгледзьцеся да сланоў Герхарда Квайзера. Якія паслухмяныя дрэсіроўшчыку гэтыя прыгожыя цяльпукі! Арыгінальны атракцыён ідзе пад назвай «рэвю сланоў». Як і ва ўсякім рэвю, тут ёсць і кардэбалет, і групавыя выступленні, і выхады салістаў. Унушальна выглядае піраміда, у якой занята ўся васьмёрка сланоў. Весела ў зале, калі велізарны форвард «Эдуард Малафееў» дакладна адпасоўвае мячы гледачам. Насцярожана змаўкаюць усе, калі чатырохтонны волат ледзь не кранаючы дрэсіроўшчыка, распластоўваецца над ім. Здзіўляюцца, гледзячы на слана, які ездзіць па манежы на трохкалёсным веласіпедзе — вядома, адпаведных памераў. І ў адзін голас ахаюць, смеючыся і апладзіруючы, калі гігант робіць стойку на галаве.

Сваёй хітрасцю і жорсткасцю белыя мядзведзі даўно ўжо здабылі сабе благую славу. Але ў ёй пачынаеш сумнявацца, калі дзесяць мішак у добрым гуморы, раскошных белых футрах выходзяць на манеж з дрэсіроўшчыцай Урсулай Бетхер. Свабодна размяшчаюцца мядзведзі на тумбах, выходзяць на выкананне трукаў. З дзіцячай радасцю цягнуць малако з бутэлечак, якія памерам нагадваюць артылерыйскія снарады дробнага калібру, а мішка, якому не далі ласунак, з зайздрасцю пагдядвае на сваіх больш спрытных калег. Адзін жа ласунок злаўчыўся нават узяць кавалачак цукру з рота сваёй гаспадыні. Усё гэта — як і катанне на санях у мядзведжай запрэжцы— падобна на захапляючую забаву. Поспех нумару з Урсулай Бетхер — адзінай у ГДР утаймавальніцай белых драпежнікаў — справядліва дзеліць яе асістэнт Хорн Манфрэд.

Гэтым не вычэрпваецца «звярыны» арсенал цырка «Аэрас». Нас яшчэ чакае сустрэча з Рудзі Борнам і яго групай усурыйскіх тыграў.

Зноў здзіўляе натуральнасць паводзін паласатых драпежнікаў. Дрэсіроўшчык знайшоў дакладную грань суадносін паміж звярынай сутнасцю грозных партнёраў і шліфам, які надала ім дрэсура. У выніку адно не падаўляе другое. Спакойна, без націску на вонкавы эфект вядзе Рудзі Борн сваю сапраўды небяспечную гульню.

Цікава выступаюць Хапіс — эксцэнтрыкі з падкіднымі дошкамі. Да дэталяў прадумана выступленне акрабатаў-турністаў Рэктанс.

Паветраны палёт называюць рамантыкай і класікай цырка. У строгай класічнай манеры працуюць артысты Энгелас. Паветраная гімнастка Брыгіта пад купалам цырка адчувае сябе надзвычай упэўнена. Яе практыкаванні на канаце і трапецыі складаныя, эфектныя і пластычныя.

Музыканты на губных гармоніках «Опці-трыо» — сапраўды віртуозныя выканаўцы. Яны шчасліва спалучаюць музыкальнасць з цыркавой эксцэнтрыкай. Перад іх выхадам ідзе музычная клаунада — выступаюць Бімі, Бобі і Петэр. Усе трое іграюць на розных музычных інструментах, умеюць улавіць у кожным з гэтых інструментаў іх камічную сутнасць. Клаунада праходзіць весела і лёгка пад няспынны смех гледачоў. Дарэчы, усе сцэнкі яны вядуць па-руску.

Прадстаўленне цырка «Аэрас» ідзе амаль дзве з паловай гадзіны. І ўвесь гэты час, дзякуючы добра скампанаванай праграме, выдатна вытрымліваецца тэмп. У гэтым перш за ўсё заслуга мастацкага кіраўніка Адзі Грабера.

З аркестрам Мінскага цырка працуе дырыжор Паўль Хайнрых. Музычнае афармленне да асобных нумароў падабрана з густам. Аркестр удала суправаджае праграму. Больш таго, ён мае самастойны нумар — выконвае музычны антракт. Гэта музычная паўза набывае характар разрадкі па-за манежам — нібы маленькая перадышка, пасля якой усе зноў уцягваюцца ў жывы тэмп падзей.

Так намаганнямі ўсіх удзельнікаў паказу кожны вечар нараджаецца вясёлае, захапляючае відовішча.

Ірына ЗАЯЦ.

Мастацтва на тым баку

НА ЭКРАНАХ ПАРЫЖА

Час летніх водпускаў не паслабіў напалу вострай унутрыпалітычнай барацьбы ў французскай сталіцы. Па-свойму яе вядуць уладальнікі некаторых кіназалаў, якія выпусцілі на экраны амерыканскі кінафільм «Зялёныя берэты». Шырокія колы французскай грамадскасці актыўна выступаюць за тое, каб забараніць гэты фільм, які праслаўляе злачынствы ваеншчыны ЗША ў В'етнаме. Рух за забарону дэманстрацыі «Зялёных берэтаў» — адна з прыкметных падзей апошніх дзён у Парыжы.

Па заклiку Камуністычнага саюза моладзі на Вялікіх бульварах адбылася маніфестацыя супраць «Зялёных берэтаў». Маладыя французы неслі плакаты «Зялёныя берэты-эсэсаўцы», «ЗША—забойцы», «Спыніць амерыканскую агрэсію ў В'етнаме» і «Французская моладзь салідарная з В'етнамам».

Ярча ўспыхваюць рознакаляровыя неонавыя рэкламы вячэрняга Парыжа. Яны, дарэчы, асвятляюць вельмі няўцешную карціну, якую ўяўляюць зараз французскія экраны. Яны сведчаць аб сапраўдным нашэсці амерыканскіх і іншых замежных кінафільмаў-баевікоў, фільмаў, якія ўслаўляюць секс і прымус.

У гэтыя дні ў Парыжы, апрача фільма «Зялёныя берэты», дэманстрацыя якога выклікае абурэнне грамадскасці ва ўсіх заходнееўрапейскіх краінах, ідуць таксама амерыканскі фільм «Злачынства—наш бізнес», італьянскі «Няма літасці для мярзотнікаў», дзе, як гаворыцца ў рэкламе, Ван Кліф «жорсткі як ніколі»; японскі фільм «Мішы—без секса», «узрушальны, правакацыйны і ашаламляльны», а таксама англійская стужка «Забойца дам».

«Гонкай дзікасці» назваў парыжскі штотыднёвік «Нувель абсерватэр» такі нябачны росквіт пошласці, нізасці і насілля на экранах.

У адным са сваіх апошніх інтэрв'ю вядомы французскі кінарэжысёр Рэнэ Клеман, які зняў цудоўны фільм «Бітва на рэйках» —пра барацьбу чыгуначнікаў Францыі супраць нямецкіх акупантаў, — з болем сказаў:

— З мастацтва кіно сапраўды здзекуюцца. Грошы замянілі мастацтва. Калі вы хочаце зрабіць сапраўдны фільм, прадзюсеры ставяцца да вас з падазрэннем; перад здымкамі яны папярэджваюць: галоўнае — ніякага мастацтва. Я ганаруся тым, што мяне лічаць падазроным. Я лічу за лепшае адмовіцца ад свайго рамяства, чым здымаць кінафільмы аб свінстве.

Сённяшняе кіно на Захадзе, піша буйны дзеяч французскага кінамастацтва Анры Ланглуа, «адарвалася ад жыцця». Французская кінаактрыса Катрын Дзенеў растлумачыла сучасны тупік заходняга кіно тым, што «грошы падначалілі сабе ўсё».

Добрыя фільмы сёлета ў Францыі можна пералічыць літаральна па пальцах. Бясспрэчна, адным з выдатных дасягненняў прагрэсіўнага кіно з'явіўся кінафільм «Час жыць» Беонара Поля. Галоўныя ролі выконваюць Марына Владзі і Фрэдэрык дэ Паскуале. Гэта — стужка, прысвечаная жыццю французскага рабочага-тынкоўшчыка, якога бязлітасна эксплуатуе капіталістычнае грамадства. Такія сацыяльныя праблемы — рэдкая з'ява ў сучасным французскім кіно.

Дэмакратычная прэса дала выключна высокую ацэнку фільму «Час жыць», які сведчыць, як падкрэслівае «Юманітэ», аб «нараджэнні сацыяльнага кіно». Французскае кіно, адзначае са свайго боку штотыднёвік «Франс нувель», пачынае «адкрываць існаванне рабочага класа».

З іншых, вартых увагі фільмаў адзначым «Z», пастаўлены Костай Гаўрасам. Ён расказвае пра забойства грэчаскага дэмакрата Ламбракіса. У ім выкарыстана, у прыватнасці, музыка Мікіса Тэадаракіса, тайна вывезеная з Грэцыі. Газеты назвалі гэтую стужку «першым французскім палітычным кінафільмам».

Высокую ацэнку атрымала кінакарціна П'ера Этэкса «Вялікае каханне». Этэкса заслужана лічаць кінарэжысёрам, які адрадзіў французскі камічны фільм. У новым, чацвёртым фільме ён ва ўласцівай яму мяккай манеры з вялікім гумарам расказаў пра жыццё мужа і жонкі ў правінцыі.

Цікава адзначыць, што апошні фільм Жана-Люка Гадара «Адзін плюс адзін» пацярпеў поўны правал. Гадар здае свае пазіцыі. Няўдала дэбютаваў пасля працяглага перапынку і Жорж-Анры Клюза, аўтар кінафільма «Плата за страх», які дэманстраваўся ў Савецкім Саюзе. Яго новы фільм «Паланянка», прысвечаны праблеме сексу, прынёс адны расчараванні прыхільнікам яго таленту.

Французскае кіно перажывае зараз сур'ёзны крызіс. Паводле апублікаваных дадзеных, за восем гадоў (з 1960 па 1968 гг.) выпуск французскіх карцін скараціўся з 79 да 49 з-за фінансавых цяжкасцей і вострай канкурэнцыі амерыканскіх, італьянскіх і англійскіх фільмаў. На такім нізкім узроўні, піша штотыднёвік «Фільм франсэ», французская кінавытворчасць не была з 1955 года. З 409 фільмаў, якія дэманстраваліся ў 1968 годзе, большасць прыходзілася на амерыканскія кінабаевікі—94. За імі ідуць італьянскія карціны—74. Адчувальна вырасла доля фільмаў амаральнага зместу, эратычных, вестэрнаў і фільмаў, якія прапаведуюць насілле.

Натуральна, што колькасць кінагледачоў у Францыі катастрафічна падае. Так, напрыклад, у першым квартале 1969 года наведванне кінатэатраў скарацілася на 2,8 мільёна чалавек у параўнанні з адпаведным перыядам 1968 года. Рэзка знізілася колькасць гледачоў, якія наведваюць амерыканскія фільмы. У сезоне 1967—1968 гг. 372 фільмы з 426, якія дэманстраваліся, не сабралі і па пяцьдзесят тысяч гледачоў.

Праслаўленыя акцёры французскага кіно вымушаны здымацца ў пасрэдных, нізкапробных фільмах, якія не адпавядаюць іх таленту і духоўным патрэбам. Жан Габен заявіў, што ён перастаў бы здымацца ў кіно, калі б не трэба было ўтрымліваць дзяцей і плаціць падаткі. Паводле слоў Жана-Поля Бельмонда, ён ператварыўся ў «сапраўднага катаржніка кіностужкі».

Французская дэмакратычная грамадскасць сур'ёзна занепакоена лёсам французскага кіно. Працоўныя кінапрамысловасці, рэжысёры і акцёры кіно выступілі ў абарону сваіх жыццёвых і творчых правоў. Яны рашуча патрабавалі ад улад прыняць неадкладныя меры супраць беспрацоўя сярод работнікаў кіно і выдзеліць сродкі для стварэння нацыянальных французскіх фільмаў.

У распаўсюджанай імі лістоўцы гаворыцца: «Мы — беспрацоўныя. Нам адмаўляюць у праве на працу. Мы выступаем за тое, каб французскае кіно існавала. Мы не маем намеру плаціць сваім беспрацоўем за крызіс французскага кіно, за які мы не нясём ніякай адказнасці».

Р. СЯРЭБРАНІКАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Парыж.

Кутох калекцыянера

НА МАРКАХ— АВАНЕС ТУМАНЯН

У 1969 годзе адзначаецца стогадовы юбілей з дня нараджэння выдатнага армянскага паэта Аванеса Туманяна (1869—1923 гады).

Знаходзячыся пад дабратворным уплывам рускай класічнай паэзіі, асабліва Пушкіна і Лермантава, развіваючы лепшыя традыцыі армянскай літаратуры, Аванес Туманян прытрымліваўся ў сваёй творчасці прынцыпаў крытычнага рэалізму і народнасці. Яму належыць высокамастацкая апрацоўка народнага эпаса «Давід Сасунскі».

Аванес Туманян — таленавіты перакладчык на армянскую мову твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, М. Някрасава, М. Горкага, а таксама рускіх народных казак і былін. У сваю чаргу рад твораў Туманяна перакладзены на рускую і іншыя мовы народаў Савецкага Саюза.

Аванес Туманян адным з першых армянскіх пісьменнікаў вітаў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю і ўстанаўленне ў Арменіі Савецкай улады.

Выпуск Міністэрствам сувязі СССР 1 верасня паштовай мініяцюры прысвечаны слаўнаму юбілею выдатнага армянскага мастака слова.

У левай частцы малюнка паштовай маркі дадзен партрэт Аванеса Туманяна, справа — характэрны для Арменіі пейзаж як сімвал непадзельнасці творчасці паэта і роднай краіны.

Аўтар маркі — армянскі мастак Грача Рухян. Малюнак выкананы ў спалучэнні двух колераў — чорнага і шэра-блакітнага. Надрукавана яна спосабам высокага друкавання на мелаванай паперы.

Намінал мініяцюры — 4 капейкі. Памер па перфарацыі — 30 на 42 міліметры. Зубцоўка — грабеньчатая. Новы знак паштовай аплаты атрымаў па каталогу 3828 нумар.

Людміла КЕЛІМ.
(АДН).

НАРОДНЫЯ ТАЛЕНТЫ

Творчасць народных спевакоў і танцораў Поўначы

Самабытная і яркая песенная і танцавальная творчасць народаў розных абласцей Расіі заснавана на выкарыстанні багатага, векавога вопыту. Мастацтва, якое адточвалася і шліфавалася стагоддзямі, перадаецца з пакалення ў пакаленне, знамянуючы сабой непарыўную сувязь часоў і традыцый.

Нібы выплываюць на сцэну жыхаркі далёкай Мезені Архангельскай вобласці. Вытокі вясновага карагоду «Стаяць у слупах» бяруць свой пачатак у паганскіх часах. Пачынаецца танец з пастраення. Паважаныя жанчыны сяла ставяць дзяўчат у карагод. Але вось пачулася шырокая, распеўная мелодыя, і паплыў сам танец, поўны ўнутранага напружання і драматызму, нагадваючы ўрачыстае шэсце, аглядзіны. Хлопцы выглядваюць сабе нявест, а іх маці будучых нявестак. Вясельны карагод «Кругі», мяккі, лірычны ў выкананні мезенцаў, змейкай ўецца ад дома да дома, уцягваючы ўсё новых і новых удзельнікаў.

Народная памяць захавала цікавыя традыцыі мужчынскага многагалосага спявання. Іх дэманструе сямейны ансамбль з забайкальскага сяла Вялікі Куналей. Недзе ў сярэдзіне XVIII стагоддзя продкі іх, стараабрадцы, былі выселены з Цэнтральнай Расіі. Сяліліся яны ў Забайкаллі сем'ямі. Таму і атрымалі сваю назву сямейскіх. Спачатку манера спявання куналійцаў здаецца дзіўнай — у працяжных песнях яны распяваюць асобныя склады, іншы раз не дагаворваючы слоў. Але паступова прывыкаеш да незвыклых спалучэнняў меладычных ліній, дзе кожны голас вядзе сваю мелодыю, уплятаючыся ў тонкі поліфанічны ўзор.

З самага далёкага раёна Кіраўскай вобласці кадрыля Ланцэ. У танцы строгі рэгламент фігур чаргуецца са свабоднай імправізацыяй, якая надае яму лёгкасць і натуральнасць. І цяжка ўявіць, што яго выконваюць калгаснікі, якія ніколі не выступалі на сцэне, так добра трымаюцца яны перад вялікай аўдыторыяй.

Аграфена Глінкіна, ураджэнка Смаленскай вобласці, — вядомая захавальніца песеннага фальклору. Яна выконвае многа старажытных мелодый. Адна з іх — жалобная, лірычная песня «Гора, маё гора» пераносіць слухачоў у асветленую лучынай сялянскую хату, дзе доўгімі, зімовымі вечарамі, седзячы за прасніцай, у песнях вылівала сваю жальбу і смутак маладая жанчына.

> Горе, мое горе,
> Горюшко большое.
> Эх, кабы к этому горю
> Да родная мати.

Са здзіўляючай цеплынёй і пранікнёнасцю спявае Глінкіна свае песні, раскрываючы перад слухачамі іх хараство і напеўнасць, знаёмячы з заходне-рускім стылем спявання, мяккім і лірычным.

Рэдкай прыгажосці старадаўні вясельны абрад, такі багаты песнямі, танцамі, вясёлымі жартамі, выконваюць жыхары сяла Бегічава Курскай вобласці. Тут і жалобныя галашэнні нявесты, якая развітваецца са сваім дзявочым жыццём, радасныя песні свякрухі, якая бярэ ў дом добрую работніцу, гарэзныя жарты сяброўак, вясёлыя танцы сватоў і шафераў. Непаўторным малюнкам танца, фантазіяй вызначаецца арыгінальны карагод «Крывы танок», жывы, ліхі, тэмпераментны. Пабудаваны на імправізацыі, ён здзіўляе буйнай фантазіяй, шырынёй руху. Ускінутыя над галавой рукі, высокія скачкі, чоткі рытмічны малюнак надаюць танцу непаўторную афарбоўку.

Самабытнае мастацтва хору калгаса «Рассвет» Белгародскай вобласці. Усё вабіць у ім: і маляўнічыя касцюмы з багатай вышыўкай, арыгінальнымі ўпрыгожаннямі, шытыя залатымі ніткамі, какошнікі, якія нагадваюць караблікі, і дзівоснае багацце харавога шматгалосся, заснаванага на свабодным спляценні верхніх падгалоскаў. Спяваюць белгародцы шырока, адкрыта, як прынята спяваць у стэпах Дона. Яфім Сапёлкін запявае лірычную песню, і ўсе ўдзельнікі хору падхопліваюць мелодыю, іх галасы то зліваюцца ў адзіным гучанні, то разыходзяцца, ствараючы маляўнічы аб'ёмны малюнак.

Дзівоснае мастацтва інструментальнай ігры белгародца Емельяна Сапрыкіна. З вялікім майстэрствам іграе ён на двайной жалейцы — пастушыныя і карагодныя найгрышы.

З далёкага сяла Кабыліпа, што загубілася сярод лясоў і азёр Валагодшчыны, Мараньяна Цапава. Дзівосная памяць і жар паэтычнай імправізацыі дапамаглі ёй захаваць і данесці да нашых дзён вельмі распаўсюджаныя некалі на Русі вясельныя плачы. Плачы Мараньяны Цапавай — узрушлівы расказ аб цяжкай бязрадаснай долі сялянскай дзяўчыны, якую аддаюць за нялюбага на чужую старану.

Вясёлае, заўзятае, буйнае мастацтва жыхароў сяла Дарожава Бранскай вобласці. Карагод дарожаўцаў «Запляціся, пляцень» нагадвае хуткую жыццярадасную гульню з песнямі і посвістам. А карагодны танец «Кастрама», умела абыграны, нярэдка выклікае смех у зале сваімі дасціпнымі рэплікамі і жартамі.

Галіна ЯКУНІНА.

Сённяшні канцэрт быў удалы. Здаецца, гледачы засталіся задаволеныя...

Днём гэтых хлопцаў і дзяўчат можна сустрэць у цэхах Аршанскага льнокамбіната, а ўвечары яны ў Палацы тэкстыльшчыкаў на рэпетыцыях гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Фота К. ЯКУБОВІЧА.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

26 верасня

Першая праграма. 9-10 — Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 10-ы клас. «Сатыра Кандрата Крапівы». 9-40 — «Іван Катляроўскі». Кінанарыс. 10-00 — навіны (М) 10-15 — Для дзяцей. «Займальная азбука». Перадача сёмая (М). 10-45 — Па старонках музычных спектакляў (М). 12-00 — Праграма тэлебачання ГДР (М). 16-30 — Праграма перадач 16-35 — Для юнацтва. «Твае героі, камсамолі» 17-00 — Паўфінал кубка СССР па лёгкай атлетыцы 18-40 — Панарама навін. 19-00 — «У. І. Ленін. Хроніка жыцця і дзейнасці». «Першая Бастылія». Мастацкі фільм (М) 20-30 — «Эстафета навін» (М). 21-15 — «Вясёлыя рыбаловы». Фільм-аперэта. 21-50 — Насустрач III Усесаюзнаму з'езду калгаснікаў. «Клопат у нас адзін». 22-10 — На атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР. А. Русецкі. Зборнік вершаў «Служба святла». 22-30 — «У адзіным страі — да вялікай мэты». «Рабочы клас капіталістычных краін — адзін з асноўных рэвалюцыйных атрадаў сучаснасці». 23-00 — «А ў нас ў кастрычніку». Музычны агляд (М). 24-00 — Чэмпіянат свету па цяжкай атлетыцы. Дзённік. Перадача з Польшчы. 00-10 — Навіны (М).

27 верасня

Першая праграма. 8-25 — Праграма перадач. 8-30 — Для студэнтаў вну. «Фізіка». III курс. 9-00—«Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45—Навіны (М). 10-00 — Будзьце шчаслівымі!» (М). 10-30—«Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 10-50 — «Сустрэчы з майстрамі тэатра». Народны артыст СССР Б. Бабачкін (М). 11-50 — «Музычная шкатулка». 12-00 — У нас у гасцях—журналісты газеты Социалистическая индустрия». 12-15 — Тэлевізійны рабочы клуб «Мы — машынабудаўнікі». 13-05 — «Лясная сімфонія». Навукова-папулярны фільм. 14-10 — «Турнір дапытлівых». 14-50 — Тэлевізійны тэатр для дзяцей. А. Астроўскі. «Беднасць не загана». Тэлевізійны спектакль (М). 16-30 — «Актава». Музычны альманах. 17-20 — Каментарый дня. «На палях рэспублікі». 17-30 — Праграма каляровага тэлебачання. «Ласіная костка». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля па аповесці В. Ліпатава. «Вясковы дэтэктыў» (М). 18-30 — Чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы. Перадача з Балгарыі 20-00 — «Ленінізм — сцяг нашай эпохі». «Ленінскія прынцыпы знешняй палітыкі Савецкай дзяржавы» (М). 20-30 — Дні культуры ГДР у РСФСР «Круп і Краўзе». Прэм'ера тэлевізійнага шматсерыйнага мастацкага фільма. Пятая серыя (М). 22-00 — «Асеннія карагоды». Музычнае тэатралізаванае прадстаўленне (М) 23-00 — Спартыўны агляд (М). 23-45 — Навіны (М).

Другая праграма. 10-30 — «Утаймавальнікі стыхій». Тэленарыс (М). 10-50—Наш кінаглобус. «Рэспубліка Чад». Дакументальны фільм. 11-40 — «На-та-лі». Кінанарыс. 11-50 — «Веды». Перадача з Адэсы. 12-20 — Праграма Камчацкай студыі тэлебачання (М). 13-50 — «Здароўе» (М). 14-20—«Тэлевізійны атлас народаў СССР». Тувінская АССР (М). 14-50 — Л. Украінка. «У пушчы». Тэлевізійны спектакль. 16-30 — У эфіры «Маладосць» (М) 17-30 — Паўфінал Кубка СССР па лёгкай атлетыцы. 19-00 — Дзіцячы экран. «Клуб вясёлых чалавечкаў». Лялечныя фільмы. 20-20 — У свеце мастацтваў. «Архітэктура маскоўскага Крамля». «Народны пісьменнік Віліс Лацiс». Кінанарысы. 21-15 — Экран паўторнага фільма. «Начны госць» 22-35 — Канцэрт Сяргея Лемешава.

28 верасня

Першая праграма. 8-25 — Праграма перадач. 8-30 — Для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 — Навіны (М). 9-30 — Для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10-00 «Музычны кіёск» (М) 10-30—Для школьнікаў. Спектакль Жытомірскага музычна-драматычнага тэатра. 12-30 — «Сельская гадзіна» (М). 13-30 — Для дзяцей «Гаўрош». Мастацкі фільм 14-45 — Навіны (М) 15-00 — Для школьнікаў. Канцэртная зала «Арфей». 15-30—Праграма каляровага тэлебачання. «Клуб кінападарожнікаў» (М). 17-00—Чэмпіянат свету па мастацкай гімнастыцы. Перадача з Балгарыі. 18-00 — Праграма каляровага тэлебачання «Артыст цырка» (М). 19-15 — «Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 20-00—у эфіры —«Маладосць». Урачыстае адкрыццё III Міжнароднага маладзёжнага фестывалю эстраднай песні. Перадача з Сочы. 23-30 — «Спартыўны агляд» (М). 24-00 — Навіны (М).

КАЛІ ДРЭВА ГАВОРЫЦЬ

Над драўляным прамавугольнікам схіліўся юнак. Лёгкімі рухамі рукі, узброенай няхітрым, востра заточаным нажом, ён апрацоўвае паліраваную паверхню дошкі. Здаецца, вастрыё металу ледзь кранаецца плоскасці прамавугольніка, але праходзяць гадзіны, і на чорным полі праступаюць быццам выхапленыя з цемры фігуры ўзброеных чырвонагвардзейцаў.

«Шостае ліпеня» — так назваў сваю кампазіцыю шаснаццацігадовы Раман Луньё. Прыёмы «мастацкага пісьма» яго равесніка Уладзіміра Караля крыху іншыя. Сваю карціну «Буравеснік» ён стварае метадам інтарсіі — з кавалачкаў дрэва розных парод і адценняў.

Раман і Уладзімір — вучні прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча ў Івана-Франкова Львоўскай вобласці. Разам з сотняй сваіх аднагодкаў, якія прыехалі з усіх канцоў Украіны, яны асвойваюць складанае мастацтва разьбы па дрэве. Яшчэ больш як трыста юнакоў авалодваюць прафесіямі сталяра, чырванадрэўшчыка, цесляра, маляра, муляра.

У вучылішчы беражліва культывуюць традыцыйную ў Прыкарпацці так званую «явароўскую школу» разьбы, адметныя рысы якой — разбёны раслінны арнамент, які залацістай вяззю разліваецца па цёмным полі.

Уладзімір ПАПОЎ,
карэспандэнт АДН.

ЗДАРЫЛАСЯ Ў АНТОПАЛІ ГІСТОРЫЯ...

[Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.]

Я супраць распусты, таварыш Янусік, як і вы, я за моцную савецкую сям'ю і, скажу па сакрэцу, калі спяваюць песню «А я люблю жанатага» — адразу выключаю радыё.

Ну, вядома ж, мусіць Лехановіч не трэба было заглядацца на чужога мужчыну, і тым больш пісаць яму пісьмо. Слоў няма, гэта вельмі нядобра. Але хто дазволіў вам абражаць жанчыну, хто даў права здзеквацца з яе чалавечай годнасці?

Помню, вы мне раілі пашукаць у Антопалі нейкіх мужчын з той калоны нафтавікоў, маўляў, яны тое-сёе ведаюць пра Левановіч. Я іх не шукаў, і шукаць не збіраюся. Мужчына, які распускае плёткі пра жанчыну — не мужчына...

І яшчэ вы мне гаварылі, што строгай вымовай, якую далі Левановіч, вы папярэдзілі ледзь не самасуд, які збіраліся ўчыніць над бібліятэкаркай жыхары Антопаля. Гэта ваша фантазія, таварыш Янусік, голая фантазія.

Я спытаў пра гэта ў старшыні выканкома гарпасялковага Савета Пятра Якаўлевіча Ярошчыка. Ён даволі крытычна ставіцца да Левановіч, многае ў ёй яму антыпатычна (дарэчы, і мне таксама — я пра гэта ўжо гаварыў), але наконт уяўнага абурэння жыхароў пасёлка коратка сказаў: «Першы раз чую».

Я гутарыў з многімі антопальцамі. Некаторыя з іх працуюць ва ўстановах культуры гэта антопальскія бібліятэкары Любоў Арцёмаўна Бобрык і Вера Анатольеўна Хацько, дырэктар Антопальскага Дома культуры Леанід Андрэевіч Семянюк (у раённым аддзеле культуры яго характарызавалі як прынцыповага і сумленнага чалавека) і іншыя. І многае мне стала ясна, ва ўсякім разе зразумеў, што ананімка — брыдкая хлусня.

Між іншым і асобныя члены савета райаддзела культуры, мясцкома прафсаюза прытрымліваюцца такой жа думкі.

— Я ўпэўнена, што на Левановіч узвялі паклёп, — гаворыць Неаніла Канстанцінаўна Пашкоўская, старшыня мясцкома. — Зачытваць яе асабістае пісьмо пры ўсіх нельга было, мне проста сорамна за сябе, за ўсіх, што мы такое дазволілі.

Не магу не сказаць яшчэ аб адной ахвяры гэтай непрыгожай гісторыі. У Марыі Адамаўны ёсць трынаццацігадовы сын. Развіты, начытаны і вельмі ўражлівы хлопчык. Дык вось, колькі часу ўжо хлапчуку невядома чыімі клопатамі ўводзяць у вушы розныя агіднасці пра маці. Давялі падлетка да нервовага ўзрушэння. Хлапчанё чым вінавата? Хоць бы пра яго падумалі!

Мы, здаецца, даўно не ўспаміналі пра Тамару Пятроўну Загрэбу. А між тым, ва ўсіх гэтых падзеях яна адыграла не апошнюю ролю. Была, так сказаць, своеасаблівым каталізатарам.

—Аднойчы, — расказвае інспектар райаддзела культуры Ганна Іванаўна Палто, — да нас зайшла Загрэба і пачала плесці розную брыду пра Левановіч. Калі праз які час мы атрымалі ананімку, дык вельмі здзівіліся — многія «факты», пра якія даводзіла Тамара Пятроўна, фігуравалі і тут.

Што і казаць, дзіўнае супадзенне.

Я доўга гутарыў з Тамарай Пятроўнай. Усё хацелася неяк па-чалавечы зразумець яе. Але ўвесь час натыкаўся на халодную варожасць. У розных варыяцыях паўтарала яна адно і тое ж: «Я чалавек прынцыповы, для мяне работа вышэй за ўсё, і я патрабую сумленнай работы ад сваіх падначаленых». І тут жа, звузіўшы вочы: «А вас папярэджваю, не ўздумайце браць пад абарону Левановіч, калі не хочаце непрыемнасцей».

Пасля гэтага ў райаддзеле культуры я паўжартам сказаў, што не здзіўлюся, калі ўслед мне Загрэба пашле ў рэдакцыю пісьмо. На мяне замахалі рукамі, маўляў, што вы, хіба яна пойдзе на такое... Але я як у ваду глядзеў. Не паспеў прыехаць, як пошта прынесла ў рэдакцыю пісьмо Загрэбы. На жаль, скупая газетная плошча не дазваляе змясціць гэты ўзор высокай пісьменнасці цалкам. Па думцы яго аўтара «корреспондент» (так яна піша) займаўся сваёй справай не так, як гэта трэба, і таму «Прошу материал проверки не опубликовать, так как неправдоподобен»...

Праўдападобны, Тамара Пятроўна, дальбог, праўдападобны!

Брэст—Драгічын—Антопаль.

ЧЫТАЙЦЕ І ВЫПІСВАЙЦЕ ГАЗЕТУ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!

Пачалася падпіска на газеты і часопісы на 1970 год. Звяртаемся да вас з просьбай: своечасова, не адкладваючы на апошнія тыдні года, падпісвайцеся на газету «Літаратура і мастацтва»!

Газета разлічана на шырокае кола творчай інтэлігенцыі, работнікаў культуры, кінафікацыі, аматараў літаратуры і мастацтва. На старонках газеты вы зможаце прачытаць новыя апавяданні, вершы, урыўкі з раманаў і аповесцей беларускіх пісьменнікаў, рэцэнзіі на кнігі, спектаклі, кінафільмы.

«Літаратура і мастацтва» знаёміць чытачоў з тэатральным, музычным, архітэктурным, культурным жыццём рэспублікі, друкуе выступленні пісьменнікаў, журналістаў, дзеячоў культуры і мастацтва па грамадскіх, прафесіянальных, маральна-этычных праблемах. Шырокае адлюстраванне знаходзяць у газеце пытанні вытворчай эстэтыкі.

Падпіска на газету «Літаратура і мастацтва» прымаецца без абмежавання ў гарадскіх аддзяленнях «Саюздруку», у канторах і аддзяленнях сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Газета выходзіць два разы на тыдзень.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на год	— 4 руб. 20 кап.,
на 6 месяцаў	— 2 руб. 10 кап.,
на 3 месяцы	— 1 руб. 05 кап.,
на 1 месяц	— 35 кап.

У розніцу газета паступае ў абмежаванай колькасці.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне паэту Антону Бялевічу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 17697.